ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

АЎТОРАК, 11 КАСТРЫЧНІКА 1938 г. № 56 (398) ЦАНА 20 КАП.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

2—4 кастрычніка 1938 года адбыўся 3-ці пленум Цэнтральнага Камітэта Комуністычнай Партыі (большэвікоў) Беларусі з удзелам сакратароў абкомаў, гаркомаў і РК КП(б)Б.

Пленум абмеркаваў наступныя пытанні:

1. Аб выкананні рашэнняў Студзеньскага Пленума ЦК ВКП(б).
2. Аб прыёме новых членаў у ВКП(б).
3. Аб парткіраўніцтве комсамолам.
4. Вынікі ўборкі ўраджаю, асенняй сяўбы і выканання дзяржаўных абавязкаў.

Па ўсіх вышэйуказаных пытаннях пленум прыняў адпаведныя рашэнні.

Апрача таго пленум разгледзеў арганізацыйныя пытанні.

У сувязі з адкліканнем на іншую работу, пленум вызваліў тав. Ананьева А. А. ад работы сакратара ЦК КП(б)Б.

Пленум выбраў у склад членаў бюро ЦК КП(б)Б тав. Кісялёва К. В. — старшыню Соўнаркома БССР і т. Матвеева А. П. — сакратара Менскага абкома КП(б)Б.

Слава гераічным жанчынам нашай радзімы!

Тры совецкіх гераічных лётчыцы—Грызадубава, Осіпенка, Раскова даказалі ўсяму свету, на што здольна сапраўды свабодная жанчына краіны соцыялізма. Іх подвіг з'яўляецца новым знамянальным і красамоўным прыкладам нябачанага ў гісторыі геraізма совецкіх жанчын. Тры совецкія дачкі вялікага народа пранеслі, як сцяг, над неабсяжнымі прасторамі совецкай зямлі палкае слова «Радзіма».

Упэўнена і горда перасякаючы прасторы, куды не забіраўся чалавек, совецкія гераіні цвёрда і няўхільна выконвалі заданне краіны, партыі, таварыша Сталіна. Выконваючы ўрадавае заданне, яны вялі барацьбу са стыхіяй з адвагай і мужнасцю сапраўдных барацьбітоў краіны соцыялізма і ў гэтай барацьбе яны выйшлі пераможцамі.

«Да далёкай кропкі роднага Далёкага Усходу, дзе на забалочанай роўнядзі сярод дрымучай тайгі фінішыраваў геraічны экіпаж далёкага беспасадачнага палёту, ужо некалькі дзён прыкавана ўвага ўсёй нашай велізарнай краіны. Валенціна Грызадубава, Паліна Осіпенка, Марына Раскова на самалёце «Родина» праляцелі за 26 гадзін 29 мінут 6450 кіламетраў па маршруту, а па прамой 5947 кіламетраў ад Масквы на Далёкі Усход. І, зрабіўшы пасадку сярод балот і азёр на месцы, дзе рэдка ступае нага паляўнічага, аказаўшыся без сувязі з светам, пераносячы лішэнні і цяжкасці, тры жанчыны не разгубіліся, захавалі большэвіцкае самаўладанне і бадзёрасць духу, стойкасць і вытрымаласць—гэтыя цудоўныя рысы сталінскага племені. У гэтыя дні нашы думкі былі з Валенцінай Грызадубавай, з Палінай Осіпенка, з Марынай Расковай, нашы пачуцці належаць тром сільным і бясстрашным дачкам народа, чые адвага і мужнасць варты праклання». («Правда»).

Гэты выдатны подвіг увенчаны зараз высокай гістарычнай ацэнкай, дадзенай у віншаванні, падпісаным па даручэнню ЦК ВКП(б) і Соўнаркома СССР таварышам Сталіным, таварышам Молатавым.

«Горача віншуем вас з паспяховым і выдатным завяршэннем беспасадачнага пералёту Масква—Далёкі Усход.

Ваш геraічны пералёт, пакрыўшы па маршруту 6450 кіламетраў, а па прамой—5947 кіламетраў на працягу 26 гадзін 29 мінут, з'яўляецца міжнародным жаночым рэкордам як па прамой, так і па ломанай лініі.

Ваша адвага, хладнакроўе і высокае лётнае майстэрства, праяўленыя ў цяжэйшых умовах шляху і пасадкі, выклікаюць захапленне ўсяго совецкага народа.

Ганарымся вамі і ад усёй душы паціскаем вашы рукі».

Слаўныя совецкія жанчыны праляцелі далей усіх жанчын свету і яшчэ раз даказалі геraізм совецкіх людзей, велізарныя дасягненні навукі і магутнасць совецкай авіяцыі, выпеставанай комуністычнай партыяй і вялікім Сталіным.

Каля таежнай ракі Дукі, ля далёкага Кербі, адбылася геraічная эпапея. Партыя і совецкі ўрад кінулі на пошукі геraічных совецкіх жанчын самалёты і людзей. Больш 50 самалётаў удзельнічала ў пошуках доблесных совецкіх гераінь, зрабіўшых прымусовую пасадку ў глухой тайзе. І вось, становяцца вядомымі усёй краіне новыя імёны, імёны лётчыкаў Сахарава, Бурлакова, Дзеркунскага, якія з паветра выявілі экіпаж «Родина». Урадам былі прыняты ўсе меры па зняццю адважных гераінь і зараз доблесныя совецкія лётчыцы рухаюцца па шляху ў гор Комсамольск, якіх з радасцю сустракаюць працоўныя і выказваюць сваё глыбокае пачуццё выхаванкам большэвіцкай партыі.

Гераіні-лётчыцы былі спакойныя за свой лёс, бо яны ляцелі ў імя радзімы і ведалі, што радзіма іх не накіне. У сваім пісьме з Кербі таварышу Сталіну яны пішуць:

«На балоце, у тайзе, сярод сопак мы былі не адзінокімі—з намі ўвесь наш шматмільённы народ, партыя і Вы, таварыш Сталін».

Совецкіх лётчыц сагравалі сталінскія клопаты, — яны несліся да іх праз тысячы кіламетраў. Іх натхняла магутная сіла вялікай краіны благароднымі рысамі яе людзей і магутнасцю яе тэхнікі. І наша тэхніка, і нашы людзі яшчэ раз даказалі, што няма для іх нічога недаступнага і немагчымага.

З усіх канцоў краіны нясуцца словы любві і прывітання тром адважным лётчыцам, якія паказалі, на што здольна совецкая жанчына, выхаваная і ўзрошчаная вялікай партыяй Леніна—Сталіна. «Над бязмежнымі прасторамі краіны Советаў яны ляцелі спакойна і бясстрашна ўсё ўперад і ўперад, перамагаючы цяжкасці, што сустракаліся на іх шляху».

«Сваёй мужнасцю яны памножылі славу і веліч нашай вялікай маці-радзімы... Іх подвіг напаўняе сэрцы совецкіх жанчын гордасцю за сваіх малалых падруг», — піша народная артыстка СССР тав. М. М. Блюменталь-Тамарына. Ткачыха Трохгорнай мануфактуры Еўдакія Масленнікава з захапленнем заяўляе: «Цяпер, калі геraічны пералёт скончан, міжвольна ўяўляеш сабе: да чаго-ж вырасла наша совецкая жанчына! Толькі-ж падумаць, мы былі невукамі, непісьменнымі, многіх з нас за чалавека не лічылі, а цяпер мы па паветры лётаем. І як лётаем! Не горш многіх таварышоў мужчын». У адзін голас з імі ўсклікае трактарная брыгада Пашы Ангелінай: «Захапляемся мужнасцю і адвагай гераінь-лётчыц, якія зрабілі ў найцяжэйшых метэаралагічных умовах пералёт ад сэрца краіны — Масквы да далёкага Амура».

Такія жанчыны, якія здзівілі свет сваёй смеласцю і выклікалі захапленне нашага народа, могуць быць толькі ў краіне соцыялізма. Гэта сапраўдныя прадстаўнікі новай совецкай інтэлігенцыі, вышаўшыя з асяроддзя працоўных мас, моцна звязаныя з масамі.

Геraізм совецкіх жанчын паказвае працоўнай жанчыне ўсяго свету, на што здольна жанчына, вызваленая Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыяй. Толькі ў Совецкім Саюзе жанчына з'яўляецца раўнапраўнай і разам з мужчынай будуе соцыялістычнае грамадства. Няма такой галіны соцыялістычнага будаўніцтва, дзе-б жанчына не з'яўлялася гераіняй працы, паказваючы доблесць і геройства на карысць соцыялізма, на карысць вызвалення ўсяго працоўнага чалавецтва.

Калі фашысцкая зграя паспрабуе навязаць Совецкаму Саюзу вайну, дык яна ў радах Чырвонай Арміі сустрэне добра падрыхтаваных совецкіх жанчын і адчуе на сваёй спіне геraізм совецкіх жанчын, якія будуць абараняць справу ўсяго перадавога чалавецтва, справу соцыялізма разам з таварышамі чырвонаармейцамі і з усім працоўным народам так геraічна, як яны змагаюцца на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва.

Гэты геraічны пералёт совецкіх жанчын упісвае новую старонку ў дасягненні совецкай навукі, новую старонку ў гісторыю магутнай совецкай авіяцыі.

Слава адважным совецкім лётчыцам, якія змагаюцца за ўрачыстасць комунізма! Слава геraічным лётчыцам — Валенціне Грызадубавай, Паліне Осіпенка, Марыне Расковай, з гонарам выканаўшым сталінскае заданне!

Слава большэвіцкай партыі, якая выхавала ў народзе яснасць мэты, цвёрдасць характару, волю да перамагання цяжкасцей і ўпэўненасць у перамозе!

Слава вялікаму Сталіну, правадыру і другу ўсіх працоўных, арганізатару ўсіх перамог краіны соцыялізма!

В. ГРЫЗАДУБАВАЙ, П. ОСІПЕНКА, М. РАСКОВАЙ

Акадэмія навук Саюза ССР разам з усім совецкім народам ганарыцца вашым геraізмам — геraізмам совецкіх жанчын вялікай сталінскай эпохі, і горача вітае вас з паспяховым завяршэннем пералёту Масква — Далёкі Усход.

Прэзідэнт Акадэміі навук Саюза ССР
В. КАМАРОЎ.

Гарачае прывітанне гераіням-лётчыцам

Экіпаж самалёта «Родина»: (злева направа) камандзір самалёта В. С. ГРЫЗАДУБАВА, пілот П. Д. ОСІПЕНКА і штурман М. М. РАСКОВА. Злева — самалёт «Родина» на Шчолкаўскім аэрадроме (верасень 1938 г.) Фота Дм. Вальтэрманца. («Известия»).

З Кербі. 7 кастрычніка 1938 г.

МАСКВА, КРЕМЛЬ—

таварышу СТАЛІНУ

З Вашым імем у сэрцах мы, дочкі вялікай соцыялістычнай радзімы, праляцелі без пасадкі скрозь воблачнасць, туманы, аблядзяненні і ноч ад Масквы — сэрца неабсяжнай радзімы—да берагоў Амура. На балоце у тайзе, сярод сопак мы былі не адзінокімі — з намі ўвесь наш шматмільённы народ, партыя і Вы, таварыш Сталін. За бацькаўскія клопаты дзякуй.

ГРЫЗАДУБАВА, ОСІПЕНКА, РАСКОВА.

З Кербі. 7 кастрычніка 1938 г.

МАСКВА, КРЭМЛЬ—

таварышам Сталіну, Молатаву, Кагановічу, Варашылаву, Ежову, Мікаяну, Калініну, Жданаву, Андрэеву

Ваша заданне выканана. Беспасадачны пералёт Масква — Далёкі Усход зроблен на самалёце «Родина» за 26 гадзін 29 мінут. Пасадка зроблена на балоцістае поле ля ракі Амгунь, у ненаселенай мясцовасці. Экіпаж здароў, матэрыяльная частка ў спраўнасці.

Ад усяго сэрца дзякуем за вашы сталінскія клопаты і дапамогу, аказаную нам.

Гатовы выканаць любое заданне партыі і ўрада.

ГРЫЗАДУБАВА, ОСІПЕНКА, РАСКОВА.

ПАВЕДАМЛЕННІ АБ САМАЛЕЦЕ „РОДИНА"

6 кастрычніка першымі-ж палётамі тт. Сахарава і Дзеркунскага да «Родины» было ўстаноўлена (праз код), што тав. Раскова падышла да самалёта.

У той-жа дзень каля 11 гадзін раніцы па мясцоваму часу таварышы Грызадубава, Осіпенка і Раскова разам з парашутыстамі пакінулі свой лагер. Уся група накіравалася да берага ракі Амгунь.

Самалёты, лятаўшыя над лагерам, указалі экіпажу «Родина» найкарацейшы напрамак для следвання да ракі Амгунь. Лётчыкі прасачылі за правільнасцю руху групы.

Дастаўка экіпажа і парашутыстаў у Комсамольск забяспечана ўсімі неабходнымі сродкамі.

***

7 кастрычніка адважны экіпаж самалёта «Родина» прыбыў на кацеры па рацэ Амгунь у сяленне Каменка.

У 15 гадзін па маскоўскаму часу катер з адважным экіпажам самалёта «Родина» і з усімі яго суправаджаючымі асобамі падышоў да Кербі. Усё насельніцтва Кербі горача вітала бясстрашных дочак радзімы. Тут-жа на беразе ракі, на невялікай плошчы адбыўся мітынг.

У 15 гадзін 45 мінут адбылася размова па прамому проваду з Кербі. У Маскве ля провада знаходзіліся: народны камісар сувязі СССР тав. Берман, член урадавай камісіі тав. Картушоў, начальнік штаба пералёту тав Антонаў, Герой Совецкага Саюза палкоўнік Слепнёў і іншыя.

У Кербі да тэлефона падышла Валенціна Сцяпанаўна Грызадубава.

РАЗГАВОР ПА ПРАМОМУ ПРОВАДУ З тав. В. С. ГРЫЗАДУБАВАЙ

7 кастрычніка ў 15 гадзін 45 мінут пачаўся разгавор па прамому тэлеграфнаму проваду паміж Масквой і Кербі.

У Маскве ля апарата знаходзіўся член урадавай камісіі тав. **М. Ф. Картушоў.**

У Кербі да провада падышла тав. **В. С. Грызадубава.**

Масква: Таварыш Грызадубава, для дакладу ўраду прашу адказаць на наступныя пытанні:

Час пасадкі самалёта «Родина» па маскоўскаму часу?

Кербі: Самалёт «Родина» прызямліўся 25 верасня 1938 года ў 10 гадзін 41 мінуту па маскоўскаму часу. Прабыў у паветры 26 гадзін 29 мінут.

Масква: Чым выклікана пасадка ў данай мясцовасці? Адсутнасцю бензіна або адмаўленнем матэрыяльнай часткі?

Кербі: Матэрыяльная частка працавала выдатна. Адсутнасць бензіна выклікала пасадку ў данай мясцовасці пасля сляпога палёту.

Масква: Як Ваша здароўе, як здароўе тав Осіпенка і тав. Расковай? Асабліва гэтым пытаннем цікавіцца таварыш **Сталін** і ўрад.

Кербі: Здаровы ўсе. Раскова пераўтомлена, патрабуе адпачынку.

Масква: Які стан матэрыяльнай часткі пасля пасадкі?

Кербі: Самалёт цэлы, маторы цэлы. Усе прыборы, шыбы кабін, уключаючы кабіну штурмана, цэлы. Пасадка праведзена без выпушчанага шасі. Самалёт можа ўзляцець пасля падмярзання глебы.

Масква: Ці працаваў радыёпоўкомпас у час палёту?

Кербі: Радыёпоўкомпас адмовіў.

Масква: Як ішлі да Байкала над воблакамі ці пад імі?

Кербі: Вышыня палёту ад 4 да 7,5 тысяч метраў у воблаках і над воблакамі. Сярэдняя вышыня 6,5 тысяч метраў. Пасля Байкала — сляпы палёт. Пасля Байкала прынялі рашэнне ісці на паўночны ўсход.

Масква: Што зроблена для афармлення рэкорда? Дзе барографы? Ці цэлы яны? Ці цэлы пломбы на іх і на баках? Ці складзены акты аб пасадцы? Калі ў вас акт складзен, зараз-жа тэлеграфна перадайце ў Маскву.

Кербі: Спрыгнуўшыя на парашуце камісары засведчылі актам пасадку самалёта. Пломбы на баках і барографах цэлы. Камісарамі барографы зняты і будуць дастаўлены ў Маскву. Акты складзены, будуць перададзены пазней, бо людзі толькі-што пасля цяжкага шляху.

Масква: Таварыш Грызадубава, рэдакцыі газет «Правда» і «Красная звезда» просяць мяне задаць два «маленькіх» пытанні: усіх цікавіць як вы жылі ў тайзе?

Кербі: Жылі ў тайзе з думкай аб тым, што нас не пакіне без падтрымкі народ нашай вялікай соцыялістычнай радзімы і таварыш Сталін. Прадуктаў для мяне і Осіпенка было дастаткова. Зброі і патронаў хапала, каб адбівацца ад звяроў, якія брадзілі вакол нас.

Масква: Як адчувае сябе таварыш Раскова?

Кербі: Раскова быстра папраўляецца пасля перанесеных ёю пакут. Яна бадзёрая, поўная энергіі, вясёлая Раскова пражыла 10 сутак у тайзе, маючы паўтары пліткі шакаладу і 18 патронаў. Яна сама прышла да самалёта.

Масква: Да пабачэння! Адпачывайце таварыш Грызадубава!

Кербі: Іду. Прывітанне працоўным, усім родным.

Кербі. Экіпажу самалёта „РОДИНА"

В. ГРЫЗАДУБАВАЙ, П. ОСІПЕНКА, М. РАСКОВАЙ

Горача віншуем вас з паспяховым і выдатным завяршэннем беспасадачнага пералёту Масква—Далёкі Ўсход.

Ваш геraічны пералёт, пакрыўшы па маршруту 6.450 кіламетраў, а па прамой—5.947 кіламетраў на працягу 26 гадзін 29 мінут, з'яўляецца міжнародным жаночым рэкордам як па прамой, так і па ломанай лініі.

Ваша адвага, хладнакроўе і высокае лётнае майстэрства, праяўленыя ў цяжэйшых умовах шляху і пасадкі, выклікаюць захапленне ўсяго совецкага народа.

Ганарымся вамі і ад усёй душы паціскаем вашы рукі.

По даручэнню ЦК ВКП(б) і СНК Саюза ССР

Сталін,

Молатаў.

ПАСТАНОВА СНК САЮЗА ССР і ЦК ВКП(б)

СНК СССР І ЦК ВКП(б) **ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:**

1. АБ'ЯВІЦЬ ПАДЗЯКУ УРАДАВАЙ КАМІСІІ У СКЛАДЗЕ тт. М. М. КАГАНОВІЧА, А. Д. ЛАКЦІЕНАВА І М. Ф. КАРТУШОВА ЗА ПАСПЯХОВУЮ РАБОТУ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ЗАВЯРШЭННЮ БЕСПАСАДАЧНАГА ПЕРАЛЕТУ САМАЛЕТА «РОДИНА».

2. ПРАПАНАВАЦЬ УРАДАВАЙ КАМІСІІ ПРАДСТАВІЦЬ ДЛЯ УЗНАГАРОДЖАННЯ СПІСАК ВЫЗНАЧЫЎШЫХСЯ ТАВАРЫШОЎ ПРЫ РОСШУКУ І ЭВАКУАЦЫІ ЭКІПАЖА САМАЛЕТА «РОДИНА».

Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР— *В. МОЛАТАЎ.*

Сакратар Цэнтральнага Камітэта ВКП(б)— *І. СТАЛІН.*

РАЗГАВОР па прамому проваду з ваенурачом 2-га ранга тав. ТІХАНАВЫМ

7 кастрычніка ў 17 гадзін 53 мінуты адбыўся другі разгавор паміж Масквой і Кербі. Член урадавай камісіі тав. **М. Ф. Картушоў** выклікаў да апарата ваенурача 2-га ранга тав. **Тіханава,** які 4 кастрычніка апусціўся на парашуце да месца знаходжання самалёта «Родина» і затым суправаджаў экіпаж.

Масква: Таварыш Тіханаў, дайце падрабязную інфармацыю аб здароўі экіпажа, у асаблівасці тав. Расковай, для даклада ўраду. Паведаміце Вашу думку, як урача, ці можна дастаўку экіпажа праводзіць водным шляхам ці трэба тав. Раскову даставіць тэрмінова ў Комсамольск. Можа быць патрэбна з Комсамольска медыцынская дапамога? Улічыце пры дачы адказу, што ўзлёт гідрасамалёта з Кербі сапражон з рызыкай.

Кербі: Т. Картушоў, стан здароўя Грызадубавай і Осіпенка добры. Раскова пасля доўгага хаджэння на працягу 10 сутак і начлега ў марозныя ночы без унта на левай назе атрымала пацёртасці паверхняў падошваў абодвух ног. Гэта выклікае хваравітасць ног, што затрудняе хадзьбу. У астатнім стан здароўя без адхіленняў. Праробленны сёння Расковай водныя працэдуры. Цеплавыя працэдуры далі палягшэнне. Меддапамогі пабочнай не трэба. Адказ аб транспартыроўцы дам заўтра ў 8 гадзін, пасля яе адпачынку. Зараз Раскова нармальна спіць.

8 кастрычніка ў 4 гадзіны 10 мінут быў праведзен новы разгавор па прамому проваду паміж тав. Картушовым і ваенурачом 2-га ранга тав. Тіханавым.

Масква: Які стан здароўя т. Расковай?

Кербі: Стан рэзка палепшыўся. Яна прышла да апарата для гутаркі з роднымі.

Масква: Значыць, Вы заяўляеце, што зараз стан здароўя тав. Расковай лепш, чым быў учора?

Кербі: Стан рэзка палепшыўся ў рэзультаце прымененых цеплавых працэдур, якіх не маглі рабіць да Кербі. Далейшыя працэдуры яшчэ палепшаць стан здароўя тав. Расковай.

ГЕРАІЧНЫ ЭКІПАЖ САМАЛЁТА „РОДИНА" НА ШЛЯХУ Ў КОМСАМОЛЬСК-НА-АМУРЫ

Пасля дваццацігадзіннага адпачынку ў Кербі тт. Грызадубава, Осіпенка і Раскова 8 кастрычніка на кацеры «Дальневосточник» адправіліся ў Комсамольск-на-Амуры. Насельніцтва Кербі цёпла праважала геraічны экіпаж самалёта «Родина».

Роўна ў 11 гадзін (па маскоўскаму часу) пад захопленыя воклічы праважаючых кацер «Дальневосточник» адышоў ад берага і быстра стаў удаляцца ўніз па рацэ Амгуні.

Бясстрашных гераінь паветра суправаджае ваенурач 2-га ранга тав. Тіханаў. Апрача таго, на барту кацера знаходзяцца парашутыст, старшы лейтэнант тав. Ерэмін і прадстаўнікі мясцовых арганізацый. У вусці ракі Амгуні адважны экіпаж самалёта «Родина» чакаюць тры магутныя кацеры «Куйбышев», «Киров», «Марти» пад агульным камандаваннем дэпутата Вярхоўнага Совета РСФСР тав. Качэткова. На кацеры «Марти» падрыхтаваны для тт. Грызадубавай, Осіпенка і Расковай утульныя каюты.

Тт. В. ГРЫЗАДУБАВАЙ, П. ОСІПЕНКА, М. РАСКОВАЙ

Ад імя большэвікоў і ўсіх працоўных Масквы і Маскоўскай вобласці шлем гарачае прывітанне вам, адважным дочкам геraічнага совецкага народа, паспяхова завяршыўшым выдатны беспасадачны пералёт Масква—Далёкі Усход.

Сваім подвігам вы паказалі ўсяму свету, на што здольны совецкія жанчыны, выхаваныя вялікай партыяй Леніна—Сталіна. Мы ганарымся вашай мужнасцю і адвагаю.

Слава гераіням-лётчыцам, з гонарам выканаўшым сталінскае заданне!

Працоўныя сталіцы з радасцю чакаюць вашага звароту ў Маскву.

МАСКОЎСКІ АБЛАСНЫ І ГАРАДСКІ КАМІТЭТЫ ВКП(б).

СЛАВА АДВАЖНЫМ І МУЖНЫМ!

ТРЫ АРЛІЦЫ

ЛЕТЧЫЦАМ САМАЛЕТА „РОДИНА"

Ой, далёка заляцелі
Гордыя арліцы!
Даляцелі, палі-селі
У славе на зямліцы.

Тры арліцы-чараўніцы
Свет зачаравалі,
І даломy, з свята быццам,
Вяртаюцца ў хвале.

А ляцець было нялёгка, —
Груган чорны пеўзіў,
Шлях няведаны шырока
Небяспекай слаўся.

Там—пад імі—ветры, пушчы,
Багнішчы, імшары,
А над імі чорнай гушчай
Воблакі і хмары.

Ды адважных не спужалі
Ні груган, ні ночка,—
Паляцелі вышай далей
Савецкія дочкі

Церав віхры, завальніцы,
У глухіх прасторах,
Шляхі значылі арліцам
Крамлёўскія зоры.

Ох, арліцы, добра лётаць
Сцежкамі такімі.
Дае ляцець з тваім палётам
Сталінскае імя!

Янка КУПАЛА.

Менск, 10-X—38 г.

ПРЫВІТАННЕ ВЦСПС

ЭКІПАЖУ САМАЛЁТА „РОДИНА"

Прэзідыум Усесаюзнага Цэнтральнага Совета прафесіянальных саюзаў горача вітае і віншуе вас з паспяховым скančэннем рэкорднага для жаночых пералётаў на дальнасць па маршруту Масква — Далёкі Усход.

Мы ў захапленні ад вашага гераізма і высокага лётнага майстэрства, дазволіўшы вам у цяжкіх умовах зрабіць пасадку самалёта.

Вы, савецкія жанчыны, яшчэ раз паказалі ўсяму свету, якіх велізарных перамог дасягнула краіна сацыялізма пад кіраўніцтвам вялікай партыі Леніна-Сталіна ў стварэнні перадавой тэхнікі і выхаванні выдатных герачных людзей эпохі Сталінскай Канстытуцыі.

З нецярпеннем чакаем вашага звароту ў сталіцу краіны Советаў — Маскву

ПРЭЗІДЫУМ УСЕСАЮЗНАГА ЦЭНТРАЛЬНАГА СОВЕТА ПРАФЕСІЯНАЛЬНЫХ САЮЗАЎ

СЛАВА ГЕРАІНЯМ!

Кампазітары Совецкай Беларусі разам з усім народам нашай цудоўнай краіны ганарацца мужнасцю, адвагаю і гераізмам трох выдатных дачок радзімы — лётчыц Грызадубавай, Осіпенка і Расковай. Яны не толькі ўстанавілі сусветны рэкорд, але паказалі ўсяму свету, на што здольны совецкія жанчыны, вам вялікі совецкі народ, выхаваны бацькоўскай ласкай і клопатамі мудрага Сталіна.

Слава гераіням!

Дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР БАГАТЫРОЎ, ТУРАНКОЎ
Кампазітары: АЛАДАЎ ЕФІМАЎ ШЧЭГЛОЎ, ПАДКАВЫРАЎ.

ПРЫВІТАННЕ СТАЛІНСКІМ ПІТОМЦАМ!

Колькі дзён совецкія людзі з хваляваннем браліся за свежую газету, падыходзілі да рупара радыё з адною мэтаю, з адной надзеяй: ці ёсць вестка пра храбрых, ці ёсць вестка пра мужных. І ніводзін чалавек у вялікай совецкай сям'і не дапускаў і думкі аб тым, што яны, сталінскія пітомцы, не пераможуць. Кожны горача верыў у перамогу, кожны ведаў, што блізак час сустрэчы адважных герояў, якія прымножылі славу совецкай тэхнікі, славу сокалаў мужных шчаслівай радзімы.

Прывітанне-ж вам, гераіні адвагі і мужнасці, высока ўзнёсшыя крыллі шчаслівай радзімы, высока ўзнёсшыя гонар і славу совецкай жанчыны

Міхась ЛЫНЬКОЎ.

ГЕРАІЗМ СОВЕЦКІХ ЛЮДЗЕЙ НЕ ВЕДАЕ МЕЖАЎ

Вялікая сталінская эпоха выхавала новых людзей, бязмежна адданых сваёй вялікай радзіме і свайму праваДыру таварышу Сталіну. Таварыш Сталін і радзіма — натхняюць іх на подвігі, даюць сілу ствараць тое, што было немагчымым у іншых абставінах.

Працоўная жанчына Совецкага Саюза стала кавалём свайго шчасця, свайго жыцця, стала роўнапраўным членам нашага грамадства. Бліскуча даказалі гэта таварышы Грызадубава, Осіпенка і Раскова.

У надзвычай складаных умовах, перамагаючы цяжкасці няведанай трасы, гераіні-жанчыны правялі свой самалёт на Далёкі Усход, паказалі вялікае майстэрства і адвагу, гераічна перамаглі перашкоды, якія паставіла ім суровая прырода.

Іх гераізм натхняе кожнага совецкага чалавека на подвігі.

Слава гераіням! Слава нашай радзіме! Слава вялікаму Сталіну!

М. КЛІМКОВІЧ.

АДКАЗ СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ ПІСЬМЕННІКАМ ЧЭХАСЛАВАКІІ

Дарагія нашы сябры і субраты!

Мы атрымалі ад вас вашу хвалюючую адозву «Да сумлення ўсяго чалавецтва».

У дні, калі адбылося страшнае здрадніцтва і войскі фашысцкіх варвараў пры дапамозе ўрадаў Англіі і Францыі раздзіраюць жывое цела вашай міралюбівай дэмакратычнай краіны, мы, совецкія пісьменнікі, ад глыбіны нашага сэрца выражаем вам нашу братэрскую салідарнасць, нашу любоў.

У гэтыя грозныя гадзіны ведайце, што мы з вамі, з вашай мужнай краінай, якая нясе цяжкія ахвяры.

Сумленне чалавецтва, да якога вы звяртаецеся, не можа не ўздрыгануцца ад абураючай, зняважлівай несправядлівасці, зробленай над вашай краінай.

Мы захапляемся вытрымаласцю і мужнасцю вашага народа, захапляемся вашай вернасцю яму.

Няхай фашысцкія варвары ведаюць, што ніякія ахвяры не зломяць свабоднага духу чэхаславацкага народа. Вы не будзеце адзінокі, мы вас не пакінем, мы вам дапаможам.

А. Талстой, А. Фадзееў, В. Герасімава, С. Кірсанаў, В. Лідзін, А. Новікаў - Прыбой, В. Фінк, І. Лежнеў, Н. Зар'ян, О. Вайшынская, В. Стаўскі, І. Сельвінскі, Н. Пагодзін, Л. Славін, В. Катаеў, А. Карнейчук, Ф. Гладкоў, І. Новікаў, Вс. Іваноў, М. Джаліеў, Г. Лахуці, В. Верасаеў, А. Серафімовіч, Н. Асееў, К. Трэнеў, Вс. Вішнеўскі, Р. Грыгаран, Ю. Лебедзінскі, А. Безыменскі, Міх. Голодны, Н. Ляшко, А. Жараў, Е. Усіевіч, В. Ермілаў, А. Караваева, Міх. Шолахаў, Л. Леонаў, М. Шагінян, К. Паустоўскі, В. Ільенкоў, Г. Шторм, Ю. Яноўскі, А. Капыленка, М. Бажан, А. Барто, В. Біль-Белацэркоўскі, П. Антакольскі, А. Файко, І. Мосашвілі, А. Макарэнка, В. Лугаўскі, Т. Ахумян, А. Платонаў, І. Бабель, П. Паўленка, С. Маршак, В. Бахмецьеў, Ф. Юлдашаў, Б. Лаўрэнеў, О. Форш, М. Слонімскі, Ю. Тынянаў, Сатты Хусаінаў, Н. Вірта, А. Усенбаеў, Б. Пастэрнак, К. Федзін, І. Фрэнкель, В. Перцэў, П. Собалеў, Янка Купала, Якуб Колас, Перец Маркіш, Е. Петроў.

Далучаем свае подпісы. Пісьменнікі БССР:

З. Аксельрод, Зм. Бядуля, П. Броўка, М. Клімковіч, М. Лынькоў, П. Глебка, Э. Самуйлёнак, Г. Камянецкі, К. Чорны, І. Шапавалаў.

Нядаўна ў Маскве закончыўся ўсесаюзны конкурс дырыжораў
НА ЗДЫМКУ: члены журы віншуюць лаўрэатаў (Злева направа) члены журы В. П. СУРЫН, народны артыст УССР — ордэнаносец А. М. ПАЗОЎСКІ, лаўрэаты М. ПАВЕРМАН і Н. РАХЛІН.

Да юбілею Т. Г. Шэўчэнка

* * *

НІЖЭЙ МЫ ДРУКУЕМ ВЕРШЫ ВЯЛІКАГА УКРАІНСКАГА КАБЗАРА ТАРАСА ГРЫГОР'ЕВІЧА ШЭЎЧЭНКА У ПЕРАКЛАДЗЕ М. КЛІМКОВІЧА.

* * *

∴

Сонца заходзіць, горы чарнеюць,
Птушкі паціхлі, поле нямее,
Радзенькі людцы, што адпачынуць,
А я дзіўлюся і сэрцам рыну
У цёмны садочак на Украіну.
Аб Украіне думку гадаю
І нібы сэрцам адпачываю.
Чарнее поле, гай і прыгоркі,
Узышла на небе красуня-зорка.
О, зорка, зорка! І слёзы хлынуць,
Ці ты ўзышла там над Украінай,
Ці за табой там з надзеяю сочаць
У небе сінім карыя вочы?
Ці мо' забылі, ці мо' заснулі?
Калі забылі, бадай заснулі,
Пра маю долю каб і не чулі.

Орская крэпасць, 1847 г.

∴

Не грэе сонца на чужбіне,
А дома цераз край пякло.
Не надта весела было
Мне і на роднай Украіне.
Ніхто мяне там не вітаў,
Ды не любіў і я нікога.
Блукаў сабе, маліўся богу
І панства злое праклінаў.
Ды ўспамінаў гады ліхія,
Далёкай даўнасці гады:
Хрыста павесілі тады,
Не ўцёк-бы й зараз сын Марыі!
Нідзе мне радасці няма.
Ды можа быць яе й не будзе,
Бо ёсць і на Украіне людзі,
Якіх і тут, у ссылцы шмат
Хацелася б. Ды й то для тога,
Каб не збівалі мне труны
Чужыя з дзерава чужога,
Або хоць прыгаршчы зямлі
З па-за Дняпра майго святога
Святыя ветры прынеслі.
Ды й больш нічога. Так-та, людзі,
Хацелася б.. Ды што гадаць!
Не варта й бога турбаваць,
Калі па-нашаму не будзе.

Орская крэпасць, 1847 г.

∴

Адзін другога мы пытаем:
«Нашто нас маці прыняла,
Ці для дабра, ці то для зла?
Нашто жывем? чаго шукаем?»
І не дазнаўшыся ўміраем,
Якая-б справа не была...
Што я пакіну, божа мілы,
На суд патомкаў на зямлі?
Хай тыя-б дзеці не раслі,
Цябе, святога, не гнявілі,
Якіх ў няволі нарадзілі
Бацькі, і ў стыд цябе ўвялі!..

Орская крэпасць, 1847 г.

∴

Самому дзіўна. А дзе-ж дзецца?
Што тут рабіць, з чаго пачаць
Людзей і долю праклінаць?
Не варта. Жыць так як жывецца.
Сярод чужых чужому жыць?
А што-ж закутаму рабіць?
Каб мог кайданы перагрызці
Я-б грыз. Ды не, няма карысці!
Не тыя кавалі кавалі.
Не так жалеза гартавалі,
Каб перагрызці. Гора нам,
Нявольнікам і сіратам
У стэпу бяскрайнім за Уралам.

Орская крэпасць, 1847 г.

А. О. КАЗАЧКОЎСКАМУ

Я быў малым, вучыўся ў школе,
Спягну, бывала, у дзяка
Якога-небудзь пятака
(Бо быў я трохі што не голы,
Убогім быў), спягну, куплю
Паперы аркуш і зраблю
Маленькі сшытачак. Крыжамі
Узорам кветачак з лісткамі
Вакол старонак абвяду
Ды й спісваю Скавараду,
Ці «тры пары і ІІ. дары»,
Схаваюся ў гушчары.
Каб не пачуў хто, не пабачыў —
Пішу адзін і слёзна плачу.

На старасці мне лёс іначў
Судзіў хавацца, як бывала,
Ад воч людскіх, куды папала
Как напісаць хоць пару слоў
І горка плакаць. Я не знаю,
За што мяне гаспод карае:
У школе рос у цяжкіх муках,
Сівею зноў-такі ў «навуках»,
Так школьнікам і пахаваюць
Відаць, за тога пятака,
Што скраў я калісь у дзяка,
Мяне сам бог дасюль карае.
Вось-жа слухай ты, мой голуб,
Мой орле-казача!
Як канаю я ў няволі,
Як на свеце плачу.
Наракаю, незадаволен
І нуджуся светам.
Навучы ты, мой казача,
Сваіх малых дзетак,
Каб не зналі яны гора —
Змалку вершаваць.
Хто-ж пакваліцца на вершы,
Хай ціхенька ў хаце
Сядзе сабе у куточку,
Вершы піша й плача,
Ды так ціха, каб сам госпад
Не чуў і не бачыў;
І каб людзі, злыя людзі,
Не чулі, не зналі,
Бо скараюць лютай карай,
Як мяне скаралі.

Як злодзей той па-за валамі
У нядзелю кралуся я ў поле,
Тыламі выйду па-над Уралам
У стэп шырокі, бы на волю.

Як рыбачка над вадою,
Сэрца ўстрапянецца,
Усміхнецца ціха-ціха,
Радасна заб'ецца
Паляціць, нібы галубка,
Па-над чужым полем,
Ажываю тады, браце,
Чую сэрцам волю,
І на гору высокую
Я іду, дзіўлюся,
Успамінаю Украіну
І ўспомніць баюся.
І там стэпы, і тут стэпы,
Ды тут не такія,
Тут чырвоныя, рудыя,
А там галубыя,
Там зялёныя, а радам
Залатыя нівы,
І высокія магілы
І лугі-даліны.

А тут бур'ян, пяскі, прагалы,
І хоць-бы дзе на смех магіла,
Якая-б сэрцу гаварыла,
Што людзі тут раней бывалі,
Ляжала пусткаю спрадвеку
Вакол зямля без чалавека
І дажыла такой да нас.
Мы, праўда, што-нішто змянілі:
Расце дзе крэпасць, дзе магілы,
Усяго нарабім, дай нам час!
О, доля мая, мая краіна!
Калі я вырвуся з пустыні,
Ці можа, крый божа,
Тут і загіну.
І пачарнее чырвонае поле...

«Айда ў казармы, айда ў няволю!»
Нібыта крыкне хто нада мною
І я ачнуся... Па-за гарою
Назад я кралуся па-над Уралам,
Як злодзей той, па-за валамі.

Вось так я, дружа мой, святкую
Нядзельку кожную святую.
А ў панядзелак, дружа-браце,
Налыйдзе ноч ў смярдзючай хаце,
Налыйдуць думы... Разаб'юць
На сто крат сэрца і надзею,
І то, што выказаць не ўмею,
Прагоняць прач і пракляпуць.
І спыняць ноч. І спыняць час.
Галзіны пягнуцца вякамі,
І я крывавымі слязамі
Пасцелю вымачу не раз.
Перабяру ўсё паволі,
Каго, калі і дзе любіў,
Каму, калі дабро зрабіў?
Нідзе, нікому і ніколі,
Пражыў, як у лесе прахадзіў,
А кажуць, сілы быў вялікай,
Ды сіла выйшла на пазыкі,
А воля ў людзях напілася,
Яна к Міколу заблудзіла
І піць навекі заракласа.
Не паможа, мілы божа,
Як то кажуць людзі,
Будзе каяння на свеце,
Варочце не будзе.

Малюся богу, каб задняла,
Як волі, сонца я чакаю.
Цвіркун замоўкнуў «Зору» б'юць,
Тады малюся, каб сцямнела,
Бо на пазорышча вядуць
Старога дурня муштраваці,
Каб знаў як волю шанаваці,
Каб знаў, што дурня ўсюды б'юць.

Так дзень мінае, год мінае
І можа, дружа, усе гады
Сплывуць, як той струмень вады..
За праўду кару я прымаю
І долі не кляну.

Гады мінаюць маладыя,
Мінула доля, дні благія
Ідуць бясконца, а надзея,
У сэрцы думкі-іскры сее:
А мо' яшчэ дабро пабачу,
А можа ліха пераплачу,
Вады дняпроўскае нап'юся,
З табой спаткаюся, мой браце,
І можа, ў ціхай новай хаце
За табою буду размаўляці,
З табою, дружа мой.. Баюся,
Баюся марыць і пытаці...

Ці што споўніцца з тых мараў,
Ці мне будзе трэба
На цябе, на Украіну,
Глянуць толькі з неба?..
А часамі так бывае,
Што і слёз не стане,
І хацеў-бы прасіць смерці,
Ды у думках ўстане
Украіна, Днепр, ты—браце,
Бліснe зноў надзея
І прасіць у бога смерці
Не хачу, не смею.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ АЛІМПІЯДА МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ

Мастацкая самадзейнасць народаў БССР сустракае дзве святочныя даты — дваццатую гадавіну ленінска-сталінскага комсамола і 21-ю гадавіну Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі — дэманстрацыяй сваіх дасягненняў. У канцы кастрычніка ў азнаменаванне гэтых двух дат у Менску адбудзецца III усебеларуская алімпіяда мастацкай самадзейнасці, якой будуць папярэднічаць раённыя, гарадскія і абласныя алімпіяды.

Народная творчасць дасягнула ў нашай рэспубліцы, як і ва ўсіх іншых братніх рэспубліках Совецкага Саюза, бурнага росквіту. Вызваленыя ад капіталістычнага прыгнёту і эксплаатацыі, выведзеныя на шырокія прасторы светлага і радаснага жыцця, народы краіны Советаў ствараюць новае мастацтва — нацыянальнае па форме і соцыялістычнае па зместу. Радаснае, шчаслівае забяспечанае жыццё выклікае патрэбнасць весяліцца, спяваць, танцаваць, тварыць. Словы таварыша Сталіна «Жыць стала лепш, жыць стала весялей» з'яўляюцца невычарпальнай крыніцай народнай творчасці.

Працоўныя Беларускай ССР праяўляюць у галіне мастацтва, мастацкай самадзейнасці велізарную ініцыятыву і актыўнасць. Паводле далёка няпоўных даных, у БССР налічваецца звыш двух тысяч самадзейных гурткоў (драматычных, харавых, музычных і харэаграфічных), якія ахапляюць каля 30.000 чалавек.

Асабліва пашыраны драматычныя гурткі, прычым многія з іх так добра авалодалі гэтым жанрам, што не палохаюцца самых адказных п'ес і ставяць «Васу Жалезнову», «На дне» М. Горькага, «Славу» Гусева, «Вочную стаўку» бр. Тур і Шэйніна, «Любоў Яравую» К. Трэнева і інш.

Багаты рэпертуар музычных, харавых і танцавальных гурткоў. Праўда, рэпертуар некалькі аднастайны, але гэта тлумачыцца тым, што кожны гурток імкнецца авалодаць самымі лепшымі творамі, самымі папулярнымі і даходчывымі. На некаторую аднастайнасць рэпертуара мае ўплыў таксама недахват музычнай і харавой літаратуры, асабліва вялікі недахват п'ес.

Усё-ж нашым гурткам мастацкай самадзейнасці ёсць што паказаць, ёсць што прадэманстраваць перад шырокімі масамі працоўных. Гэта з дастатковай пераканальнасцю паказалі першая і другая ўсебеларускія алімпіяды мастацкай самадзейнасці, якія высунулі сотні выдатных калектываў і тысячы добрых выканаўцаў.

Няма ніякага сумнення, што і III ўсебеларуская алімпіяда мастацкай самадзейнасці пакажа далейшыя дасягненні ў гэтай галіне. Прысвечаная двум вялікім датам, алімпіяда павінна паказаць росквіт народнай творчасці і ўдзел у ёй ленінска-сталінскага комсамола і шырокіх мас моладзі.

Вядома, што асноўнае ядро амаль усіх гурткоў мастацкай самадзейнасці складае моладзь. Маладыя патрыёты совецкай краіны горача любяць сваю радзіму, беззаветна адданы свайму народу, комуністычнай партыі, вялікаму Сталіну, і імкнуцца адлюстраваць свае глыбокія пачуцці ў мастацкіх вобразах, у песнях, танцах, выяўленчым мастацтве.

Трэцяя алімпіяда мастацкай самадзейнасці бяспрэчна адлюструе велізарны культурны і мастацкі рост нашай слаўнай моладзі, якая прымае актыўны і энергічны ўдзел у соцыялістычным будаўніцтве і забяспечвае далейшыя перамогі на шляху да комунізма.

У раёнах Совецкай Беларусі пачаліся ўжо алімпіяды мастацкай самадзейнасці, на якіх павінны быць адабраны лепшыя калектывы і выканаўцы для абласных алімпіяд. Прадстаіць вялікая арганізацыйная работа, у якую павінны актыўна ўключыцца партыйныя, комсамольскія, профсаюзныя і совецкія арганізацыі.

Згодна пастановы бюро ЦК КП(б)Б, камісіі па падрыхтоўцы і правядзенню алімпіяд арганізуюцца пры партыйных камітэтах на чале з членамі бюро абкомаў, райкомаў, гаркомаў. Гэта адно сведчыць аб велізарным значэнні, якое надае ЦК КП(б)Б алімпіядам мастацкай самадзейнасці. Гэта павінны поўнасцю ўлічыць, у першую чаргу, тыя арганізацыі, якія нясуць непасрэдную адказнасць за мастацкую самадзейнасць на прадпрыемствах і ў калгасах. Мы маем на ўвазе профсаюзы і органы Наркамасветы. Між тым, як профсаюзы так і органы асветы ўключыліся ў падрыхтоўку алімпіяд недастаткова рашуча і актыўна. Мала «спусціць» дырэктыўныя ўказанні (хоць і гэта было зроблена з вялікім спазненнем). Трэба выехаць на месцы, на прадпрыемствы, у калгасы, дапамагчы арганізаваць выступленні гурткоў самадзейнасці найлепшым чынам.

Работнікі мастацтва, мабілізуемыя Упраўленнем па справах мастацтваў для адбору лепшых калектываў, не змогуць, зразумела, аддаць дастаткова ўвагі ўсім пытанням падрыхтоўкі да алімпіяд. Трэба паклапаціцца аб касцюмах, музычных інструментах, грыме і сотнях іншых «дробязей», якія часта вырашаюць поспех выступлення гуртка. Трэба старанна праверыць рэпертуар, адабраць сапраўды самае лепшае, вартае ўвагі грамадскасці.

Профсаюзы, органы Наркамасветы, комсамольскія арганізацыі павінны актыўна ўключыцца ў падрыхтоўку і правядзенне алімпіяд. Трэба паслаць людзей на прадпрыемствы, у калгасы, дапамагчы гурткам самадзейнасці і паасобным выканаўцам выступіць добра падрыхтаванымі.

Трэцяя ўсебеларуская алімпіяда павінна паслужыць магутнай зарадкай для далейшага ўздыму ідэйна-палітычнага і мастацкага ўзроўню калектываў і паасобных выканаўцаў, для падрыхтоўкі мастацкай самадзейнасці БССР да выканання важнейшых палітычных задач: паказу мастацкай самадзейнасці на ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы і ў часе дэкады беларускага мастацтва ў Маскве.

Таму і ў перыяд падрыхтоўкі да алімпіяд, і ў часе іх правядзення трэба самым старанным чынам праналізаваць творчасць лепшых калектываў, дапамагчы ім узняцца на больш высокую ступень як з пункту погляду выбару рэпертуара, так і з боку мастацкага выканання яго.

Усё гэта патрабуе ад кіруючых арганізацый і ўстаноў самага ўдумлівага і канкрэтнага падыходу да падрыхтоўкі і правядзення алімпіяд, самай актыўнай і энергічнай дапамогі гурткам мастацкай самадзейнасці.

* * *

8 кастрычніка пад старшынствам намесніка старшыні СНК БССР тав. Захарава адбылося чарговае пасяджэнне рэспубліканскай камісіі ЦК КП(б)Б па правядзенню трэцяй усебеларускай алімпіяды мастацкай самадзейнасці, прысвечанай 20-годдзю ленінска-сталінскага комсамола і 21-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

Загадчык Віцебскім аддзелам па справах мастацтваў тав. Саламонік і член рэспубліканскай камісіі тав. Гантман далажылі аб падрыхтоўцы да алімпіяд па Віцебскай вобласці. Падрыхтоўка фактычна пачалася з 3 кастрычніка. У дапамогу раёнам накіравана 19 чалавек. Слаба ўключыліся комсамольскія арганізацыі, фабзаўкомы, радыёвяшчанне, друк. У клубе трыкатажнікаў (фабрыка імя Клары Цэткін) доўгі час існаваў выдатны чатырохгалосы хор. Гэты хор ужо два месяцы як не працуе. У прыватнасці, абласны аддзел па справах мастацтваў не мае ўліку гурткоў самадзейнасці, не ведае, дзе якія гурткі працуюць. Кіруючыя арганізацыі вобласці рашылі чамусьці абмежаваць лік гарадскіх удзельнікаў абласной алімпіяды 150 гуртkоўцамі і выканаўцамі, у той час як Віцебск можа вылучыць значна больш удзельнікаў самадзейнасці.

Аб падрыхтоўцы да алімпіяд па Палескай вобласці зрабіў інфармацыю загадчык Палескім аблана тав. Сомаў. Указанняў раёнам было дана багата, але падрыхтоўка разгорнута слаба. Чакаюць дапамогі цэнтральных арганізацый. Між іншым, палеская абласная камісія рашыла правесці абласную алімпіяду «паміж 20 кастрычніка і 1 лістапада», ставячы гэтым самым пад пагрозу зрыву своечасовы выезд палескіх калектываў на ўсебеларускую алімпіяду. Палескім таварышам прапанавана закончыць абласную алімпіяду з такім разлікам, каб лепшыя калектывы маглі прыехаць у Менск да 27 кастрычніка.

З інфармацыі загадчыка Менскім абласным аддзелам па справах мастацтваў тав. Уханава высвятлілася, што Менская абласная камісія па правядзенню алімпіяды бяздзейнічае. Мяркуючы па паведамленнях з 17 раёнаў, у большасці з іх да алімпіяд не рыхтуюцца. У дапамогу раёнам паслана 12 чалавек.

Дырэктар Дома народнай творчасці тав. Рубенчык паведаміла, што ў дапамогу раёнам пасланы 24 работнікі (9 чалавек дадаткова выехалі 9 кастрычніка). Адмовіўся вылучыць некалькіх сваіх работнікаў Тэатр юнага гледача.

Некалькі вясёлых мінут выклікаў сваім «дакладам» прадстаўнік Наркамасветы — работнік аддзела палітпрасветработы тав. Пракопаў. Пачаўшы з таго, што «палітпрасветы на месцах з'яўляюцца цэнтрамі мастацкай самадзейнасці», тав. Пракопаў закончыў свой двухмінутны «даклад» тым, што ніякіх даных аб падрыхтоўцы алімпіяд у Наркамасветы няма і што «высвятліць што-небудзь вельмі цяжка». Намеснік наркома асветы тав. Макаревіч, які прысутнічаў на пасяджэнні камісіі, не палічыў нават патрэбным дапамагчы свайму работніку выйсці з цяжкага становішча. Гэта лішні раз пераканала членаў камісіі, што Наркамасветы сапраўды вельмі далёка стаіць ад кіраўніцтва мастацкай самадзейнасцю ў калгасах.

Рэспубліканская камісія вымушана была зрабіць вывад, што падрыхтоўка да алімпіяды праходзіць нездавальняюча. Камісія прапанавала абласным і раённым арганізацыям паслаць у дапамогу самадзейным гурткам не толькі работнікаў мастацтва, але і арганізатараў (партыйных, комсамольскіх, профсаюзных і клубных работнікаў); узмацніць асвятленне падрыхтоўкі да алімпіяды ў друку, па радыё; у кінатэатрах перад кожным сеансам даваць хроніку аб алімпіядах; узмацніць аператыўнае кіраўніцтва пачаўшыміся раённымі алімпіядамі; наладзіць улік усіх калектываў мастацкай самадзейнасці, паасобных выканаўцаў, іх рэпертуара.

Для ўдзелу ва ўсебеларускай алімпіядзе вырашана запрасіць прадстаўнікоў Масквы, Ленінграда і Кіева.

В. Д.

У ДАПАМОГУ НАСТАЎНІКУ

Паэма „Дзесяты падмурак“ Паўлюка Труса

В. БАРЫСЕНКА

«Дзесяты падмурак» — лебядзiная песня, якая прагучэла на 25 годзе жыцця паэта. Паэма «Дзесяты падмурак» у ідэйных і мастацкіх адносінах найбольш спелы твор П. Труса і паказвае з усёй неаспрэчваемай відавочнасцю на творчы рост пісьменніка, на размах яго рэалістычнага таленту. Іменна ў гэтай паэме паэт перамагае і вызваляецца ад уласцівых яму ў ранейшых творах недахопаў і, праразбіўшы вялікую ідэйную і мастацкую эвалюцыю, моцна становіцца на пазіцыю поўнакроўнага рэалізма, назаўсёды звязаўшы свой лёс з лёсам будаўнікоў сопыялістычнага грамадства.

Прысвечаная 10-годдзю Совецкай Беларусі, паэма адлюстроўвае самыя яркія і найбольш істотныя працэсы, меўшыя месца і знаменаваўшыя сабою гаспадарчае, палітычнае і культурнае жыццё Совецкай Беларусі на этапе соцыялістычнай рэканструкцыі. Паэтам з глыбокай гістарычнай праўдзівасцю адлюстраваны найбольш характэрныя з'явы і працэсы ў жыцці Совецкай Беларусі, звязаныя з пераможным наступам соцыялізма на векавую адсталасць Беларусі, адлюстраваны найшырэйшы працэс ператварэння Беларусі з «края палёў» у «край фабрык дымных і машын».

Паэма складаецца з чатырох раздзелаў, калі не лічыць лірычнага ўступа.

У першай і другой частках паэмы разгортваецца жахлівае мінулае дакастрычніцкай Беларусі і беларускага народа. Нацыяналістычная беларуская літаратура, у плане гнілой нацыянал-рамантыкі, падавала дакастрычніцкую Беларусь як экзатычную, адзіную бяскласавую краіну і паэтызавала патрыярхальную адсталасць, цемру і некультурнасць.

П. Трус вобраз мінулага Беларусі падае пад кутом гледжання рэалістычнага раскрыцця соцыяльнай прыгнечанасці, нацыянальнай прыніжанасці працоўных мас беларускага народа. Мінулае Беларусі паэтам малюецца як цяжкі і непрыемны сон. Кампазіцыйны прыём сну, якім карыстаецца аўтар пры адлюстраванні жахлівага мінулага беларускага народа, удалы і дапамагае раскрыць жудасць і пакуты працоўных мас Беларусі ва ўмовах страшэннага соцыяльнага і нацыянальнага ўціску. Мінулая Беларусь часоў царызма падаецца як багатая ў прыродных адносінах краіна, але ў якой страшэнна пакутуе працоўны чалавек.

Натуральная прыгожасць краіны і яе багацці рэзка кантрастуюць з «прыгожасцямі» паднявольнага і прыгнечанага жыцця працоўных мас.

Край легенд.
Крыжоў, магіл-курганаў,—
край тугі —
бальзам жывых крыніц...

На яе прасторах рассялася і пануе нядоля, «ліха-гора», па яе цярністых сцежках блукаюць і сланяюцца людзі. Стогны, плач, праклёны, сумныя песні.

Даль агорнута смугаю,
І ў смузе нізіны.
Вунь замерлі на кургане
У полі дзве хваіны.

Намаляваўшы рэалістычна і ярка вобраз Беларусі ў мінулым, паэт пераходзіць ад сабіральнага вобраза краіны да палачы паасобных персанажных вобразаў, у якіх увасабляецца народная нядоля, г. зн. паэт канкрэтызуе ва вобразах людзей рысы, якімі надзяляецца соцыяльнае жыццё Беларусі дакастрычніцкага часу. У фальклёрнаказачным стылі вытрыман паэтычны паказ вобраза мацеры і сына, як сімвалы прадстаўнікоў бядняцкіх мас беларускага народа. У цэнтры раздзела пастаўлена сцэна развітання маткі з сынам. Маці-бядначка выпраўляе свайго сына ў далёкую дарогу, выпраўляе ў свет на пошукі хлеба.

Сын, выгнаны галадухай з наседжанага бацькоўскага гнязда, цвёрда верачы ў людзей і свет, адпраўляецца за пошукамі хлеба, за пошукамі долі.

Вобраз мацеры, ледзь намечаны аўтарам даецца ў плане замалёўкі псіхалагічных, рэзка-афарбаваных у соцыяльны тон, перажыванняў мацеры, зафіксаваных у форме іх знадворнага, знешняга выражэння:

Не каліна над вадою
пахіліла голле, —
плача маці
сярод поля,
праклінае долю.
Праклінае
дні і леты,—
ломіць пальцы-рукі.
Боль варушыцца на сэрцы
чорнаю гадзюкай.

Лірычны вобраз аўтара атаесамліваецца і поўнасцю зліваецца з вобразам сына. Псіхалагічнае і соцыяльнае аблічча сына раскрываецца ў форме лірычнага маналога, накіраванага да мацеры. У гэтым маналогу як і ў песні жабракоў і праклёнах мацеры, асноўным матывам гучыць скарга на праклятую цяжкую нядолю, у якой адлюстроўваецца цяжкасць жыцця ажабрачаных працоўных мас беларускага народа.

Народная нядоля яшчэ горш паглыбляецца ў сувязі з наступленнем імперыялістычнай вайны. У другім раздзеле твора разгортваюцца жахлівыя і крывавыя абразкі імперыялістычнай вайны, якая прынесла з сабой смерць, разруху, пажары і паглыбленне народных пакут і жабрацтва.

Чую стогны, плач і роспач, —
паміраюць людзі.
Ветры сіплыя ўссыпаюць
жвір,—пясок на грудзі.
Слёзы... Кроў... Літанне... Жудасць
І крыжы на ўсходзе...
А над вогнішчам жахлівым
Сонца узыходзе.

Такім устае перад намі вобраз Беларусі ў мінулым, як адсталай калоніі расійскага самаўладства, і жабрацкае жыццё працоўных мас беларускага народа. У глыбока-рэалістычным паказе гэтых бакоў соцыяльна-эканамічнага жыцця дакастрычніцкай Беларусі заключаецца каштоўнасць і аб'ектыўна-пазнавальнае значэнне твора.

Як кантраст, поўная процілегласць вобразу мінулай Беларусі, падаецца светлы сонечны вобраз Совецкай Беларусі. Толькі пры совецкай уладзе Беларусь перастала быць краем «легенд, крыжоў, магіл-курганаў», толькі ва ўмовах совецкай улады Беларусь ператварылася ў квітнеючую краіну,— такая асноўная вызначаючая ідэя паэмы ў цэлым. Совецкая Беларусь у процілегласць мінулай Беларусі—гэта край «громаў-навальніц», край, «дзе пульсуе радасць» і шпаркімі шырокімі тэмпамі, рукамі працоўных мас будуецца соцыялізм, светлае і шчаслівае жыццё. Беларусь за гады совецкай улады пакрылася волатамі-прадпрыемствамі, якія сведчаць аб тым што Беларусь з «края палёў» ператвараецца ў краіну індустрыяльную.

Творчы міг... Напорная імглівасць...
Працай тут заняты муляры,
І пад небам зорнасці маўклівай
Вырастаюць волаты-муры.

Сваёй прыгажуні-краіне, Совецкай Беларусі, паэт прысвячае прачуўныя словы. Ён з вялікім захапленнем апявае радасць яе жыцця, з захапленнем вітае і апявае шырокі размах соцыялістычнага будаўніцтва, нябачаны рост і нябывалы росквіт совецкай краіны.

Хто-ж галаў, як
наплывалі хмары,
Хто-ж галаў, хто
думаў, а ці сніў,
што краіна сонечнага надхмар'я расцвіце у чырвані
зарніц!

—лірычна ўсклікае аўтар, захоплены чароўнай совецкай рэчаіснасцю.

П. ТРУС.

І калі ў першых двух раздзелах паэт рэалістычна адлюстраваў некаторыя істотныя бакі дакастрычніцкай беларускай рэчаіснасці, то ў найбольш удалым, сапраўды мастацкім трэцім раздзеле. Трус маляўніча адлюстраваў у чоткіх паэтычных вобразах працэс гаспадарчага і культурнага росту Совецкай Беларусі, працэс ператварэння Беларусі з адсталай, у мінулым аграрнай краіны, у краіну соцыялістычных фабрык і машын. Адлюстроўваючы працэсы соцыялістычнай індустрыяльнай Беларусі. П. Трус ярка выразіў пачуцці любві да сваёй краіны, радасці за яе светлае жыццё. У праўдзіва-рэалістычным паказе совецкай краіны, у выяўленні народных пачуццяў і дум сказваюцца народныя элементы твора.

Чацверты і заключны раздзел прысвячаецца паказу нарастання рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі ва ўмовах страшэннага прыгнёту і ўціску. У хвалях Нёмана чуюцца ўсе цяжкасці паднявольнага жыцця працоўных Заходняй Беларусі.

Адна за другою
напорна імкне, —
стыхію душою паслухай.
У ёй чуецца крыўда —
успенены гнеў,
людская адвечная скруха.

Паэт звяртаецца да працоўных мас капіталістычных краін з голасным рэволюцыйным заклікам падняцца на барацьбу за сваё соцыялістычнае вызваленне.

Арлы маладыя—
нявол сыны,
ўзнімайце халодныя крыллі.
Хоць рукі закованы
ў сталь-кайданы,
а сілу рыхтуйце вы сіле.

Паэт цвёрда верыць у няўхільную перамогу пролетарскай рэволюцыі ва ўсім свеце.

Надыйдзе збавенне,
Не трапце надзей. —
распальвайце ў сэрцы паходні
І ў муках змагання
народзіцца дзень
з-пад хмараў маўклівых, заходніх.

Паэтам правільна і глыбока паказваецца ўздым і нарастанне рэволюцыйнага руху ў капіталістычных краінах у сувязі з шырокім разгортваннем соцыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне. Магутны рост совецкай краіны рэволюцыянізуе свядомасць працоўных мас капіталістычных краін.

Такія асноўныя моманты зместу лірa-эпічнай паэмы «Дзесяты падмурак».

«Дзесяты падмурак» — твор, які падымаецца над усімі паэтычнымі творамі П. Труса як па сваёй ідэйнай вышыні, так і па мастацкай якасці. Гэтым творам паэт становіцца на пазіцыі соцыялістычнага рэалізма.

Побач з рэалістычнай лініяй мы маем у творы і лінію рэволюцыйнага рамантызма. Рамантыка П. Труса ў гэтым творы паглыбляецца ў сэнсе больш шырокага ахвату і больш глыбокага пранікнення і адлюстравання рэчаіснасці. Рамантыка П. Труса, вызваляючыся ад абстрактнасці і штучнай напышлівасці, ва многім выйгрывае ў прастаце і глыбіні паказу рэчаіснасці.

Рэалістычныя і рамантычныя вобразы, у якіх увасабляецца дакастрычніцкая і паслякастрычніцкая рэчаіснасць (вобразы Беларусі, абразкі соцыяльнай абяздоленасці працоўных мас у мінулым, імперыялістычнай вайны, Заходняй Беларусі і т. д.) вызначаюцца канкрэтнасцю, праўдзівасцю і тыповасцю. Вобразы дакладна акрэслены і вызначаюцца высокай эмацыянальнай зарадкай і вялікай сэнсавай ёмкасцю.

«Дзесяты падмурак» напісаны ў фальклёрным духу. Народныя элементы, якія сказваюцца па лініі зместу ў глыбокапраўдзівым паказе рэчаіснасці і выражэнні народных пачуццяў, знаходзяць сваю аб'ектывізацыю і замацаванне па лініі формы ў народна-фальклёрных, па сваяму характару і духу, вобразах.

Кідаецца ў вочы багатая, вобразна-сімвалічная насычанасць твору. Маляўнічая і разнастайная сімволіка і паэтычныя ўвасабленні з'яўляюцца ўлюбёным паэтычным сродкам раскрыцця падзей, з'яў, працэсаў і т. д. Так, напрыклад: шчаслівае жыццё Совецкай Беларусі сімвалізуецца ў вобразе светлых агнёў соцыялістычнага будаўніцтва («І пульсуе радасць у прасторах, залатыя свецяцца агні»), у вобразе «росквіту чырвані зарніц». Соцыялістычная рэволюцыя падаецца ў вобразе сонца («А над вогнішчам жахлівым сонца узыходзіць»). Совецкая Беларусь сімвалізуецца ў вобразе края «громаў-навальніц».

Цяжкае паднявольнае жыццё працоўных мас Беларусі ў мінулым і каланіяльнае становішча краіны ўпадабляецца вобразу края «легенд, крыжоў, магіл-курганаў». Паднявольнае жыццё працоўных мас у мінулым — у вобразе «чорнай сцежкі». Змагары за народную свабоду ўвасабляюцца ў вобразе арлоў, і т. п.

Імперыялістычная вайна сімвалізуецца ў вобразе «чорных туч», «агнявых кос» і т. п.

У творы прысутнічае і агульна-народны вобраз долі. У вобразе «чорнай долі» ўвасабляецца паднявольнае жыццё беларускага народа ў мінулым. Цераз вусны маткі чуецца праклён долі, чуюцца скаргі на нядолю і праз песню жабрака. Нядоля неадчэпна хадзіла за працоўным селянінам дарэволюцыйнай беларускай вёскі. У процілегласць гэтай чорнай нядолі працоўных мас дакастрычніцкай пары аўтар ярка паказвае шчаслівую і светлую долю беларускага народа пасля перамогі Кастрычніцкай рэволюцыі.

Сімвалы, паэтычныя ўвасабленні, праз якія паэт раскрывае ў абагуленых вобразах тыповыя бакі рэчаіснасці, ідуць ад народнай творчасці.

Паэтычная мова твора яркая па сваёй вобразнасці і простая. Мова цягнее па сваіх прыёмах да паэтычных прыёмаў, уласцівых народнай творчасці. Ярка выражаная метафарычнасць—асноўная адзнака паэтычнага стылю паэта. І гэта асаблівасць паэтычнай мовы мабыць нідзе так ярка не сказалася, як у творы «Дзесяты падмурак».

У «Дзесятым падмурку» падзеі, з'явы раскрываюцца не прама, а метафарычна. Так, напрыклад, перамога рэволюцыі адлюстроўваецца ў вобразе панавання радасці — «і пульсуе радасць у прасторах, залатыя свецяцца агні», гераічныя дні грамадзянскай вайны і барацьбы за Кастрычнік расчыняюцца праз такі вобраз: «Дні прайшлі, адшалясцелі зоры на гарачых крыллях навальніц». Страшэнны соцыяльны прыгнёт у мінулым раскрываецца ў вобразе панавання ночы, панавання хмар і т. д.

У метафарах і параўнаннях прысутнічаюць элементы сімволікі. Паэт карыстаецца пашыранымі параўнаннямі. Асаблівай любоўю карыстаецца ў паэта так званыя адмоўныя параўнанні («Не каліна над вадою пахіліла голле, — плача маці сярод поля, праклінае долю») і параўнанні такога тыпу, як «Сняжынкі-дыяменты-росы».

Яркая вобразнасць звязана з ужываннем дакладных і яркіх эпітэтаў, сярод якіх ганаровае месца займаюць так званыя сталыя, традыцыйныя эпітэты. Пададзім прыклад найбольш шырока ўжываемых эпітэтаў: «шоўкавы косы», «чыстае поле», «чорствыя камені», «буйныя ветры», «цёмны гай», «залатая восень», «шоўкавыя рунi», «чорная смуга», «гарачыя крыллі навальніц» і т. д.

Асаблівую эмацыянальнасць паэтычнай мове надаюць паўторы і звароты. Паўторы ўжываюцца самых разнастайных відаў.

У паэтычнай мове «Дзесятага падмурка» захаваны лепшыя элементы і ўласцівасці паэтычнай мовы аўтара. У паэме ў цэлым і ў мове гэтага твора моцна адчуваюцца фальклёрныя песенныя матывы ў самых разнастайных кампанентах твора: вобразнай сістэме, кампазіцыі, стылістыцы і рытміцы. Па сваёй інтанацыі мова гэтага твора цягнее да беларускай народнай песні.

У творы адчуваецца на кожным кроку прысутнасць аўтара. Аўтарскія ацэнкі, звароты, выказванні ўвесь час суправаджаюць расказ. «Дзесяты падмурак» не мае строгай сюжэтнай лініі. Развіццё твора ідзе на аснове паступовага пералічэння падзей і гістарычных з'яў (жыццё працоўных да рэволюцыі і беднасць края, імперыялістычная вайна, пролетарская рэволюцыя, размах соцыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне і т. д.). Вось апорныя кропкі сюжэтнага разгортвання.

У рэалістычным паказе дакастрычніцкай беларускай рэчаіснасці, у маляўнічым паказе размаху соцыялістычнага будаўніцтва на Беларусі, у праўдзівым выражэнні пачуццяў радасці жыцця совецкага народа і любві да сваёй соцыялістычнай радзімы, у прастаце, народнасці вобразаў і паэтычнай мовы — значэнне гэтага твора ў беларускай літаратуры.

І. ЛЕВІТАН «САКАВІК»

АБ ПАЭМЕ А. КУЛЯШОВА „У ЗЯЛЁНАЙ ДУБРОВЕ“

М. ЛАРЧАНКА

Новая паэма Аркадзя Куляшова «У зялёнай дуброве» — гэта песня, прапетая сапраўдным паэтычным голасам пра новы быт калгаснай моладзі, пра новыя ўзаемаадносіны ў асабістым жыцці маладых людзей нашай калгаснай вёскі, пра іх дружнае сяброўства і таварыскасць, пра іх шчаслівае і радаснае жыццё на аснове калгаснай заможнасці. Вось той круг жыццёвых пытанняў, што знаходзіць сваё адлюстраванне ў разглядаемым творы. Ужо ў гэтым заключаецца арыгінальнасць і свежасць паэмы, таму што ў беларускай совецкай літаратуры аб такіх цікавых і актуальных пытаннях нашай рэчаіснасці мала зусім напісана. Калі-ж улічыць, што названыя жыццёвыя пытанні, якія паказваюцца ў паэме, асвятляюцца Куляшовым у своеасаблівай паэтычнай форме **лірычнай песеннасці**, дык перад намі паўстане глыбока-арыгінальны і мастацка-каштоўны твор.

«У зялёнай дуброве» — гэта не паэма ў поўным і сапраўдным значэнні гэтага слова — гэта **паэма-песня**, якая ад пачатку да канца прасякнута сардэчным лірызмам і фальклёрнай меладычнасцю. У творчасці Куляшова гэта першы твор такога паэтычнага характару. Ранейшыя яго паэмы напісаны некалькі ў другім мастацкім плане, чым гэты твор. Тут ёсць нешта новае, чаго не было ў ранейшых творах Куляшова.

Станоўчым момантам паэмы «У зялёнай дуброве» з'яўляецца тое, што тут адсутнічае тая тэматычная і сюжэтная раскіданасць, якая ўласціва была яго ранейшым паэмам («Аманал», «Гарбун»). У новай паэме ўсё дзеянне згрупавана вакол асноўнай тэмы і асноўных вобразаў, якія паказаны не ў эпічным, а ў лірычным плане. Апроч гэтага, разглядаемая паэма Куляшова вылучаецца з яго папярэдніх твораў яшчэ тым, што тут, замест эпічнасці ў паказе тэмы і дзеючых асоб, мы маем, як асноўны момант, мяккі лірызм у абрысоўцы вобразаў і падзей. Напрыклад:

Вось ёлачка тая
Над ціхай мясцінай,
Дзе першага мая
Ён страўся з Хрысцінай.
Вось поле, дзе разам
Былі за работай,
Лясок за калгасам —
Дзе бачыўся ўпотай.

Такою выключна яркай і лірычна строгай зарысоўкай падаецца той момант, калі Хрысціна-нявеста едзе да свайго любага Івана.

А вось яшчэ надзвычайны па свайму паэтычнаму майстэрству, лірычнай строгасці, сціслаcці малюнак эпізода, калі бацька прыйшоў адведаць свайго сына-пагранічніка:

Увечары з сынам
Пад хвояй сядзелі,
Над возерам сінім
На качкі глядзелі.
— Ляціць яна, во яна,
Нас не баіцца!..
—Іх біць не дазволена —
Блізка граніца.
Страляць па іх лічым
Мы забаўкай смешнай,
Удоваль нам дзічы
Хапае заможнай.

Вось у плане такога роду лірычна-песенных зарысовак падаюцца персанажныя вобразы і асобныя падзеі паэмы. Гэтыя лірычна-песенныя, сціслыя і яркія зарысоўкі з'яўляюцца мастацкай асаблівасцю паэмы; іменна яны надаюць лірычны характар усёй паэме. І гэта з'яўляецца мастацка станоўчым і каштоўным момантам. Іменна гэтыя зарысоўкі, з якіх складаецца ўся паэма, робяць яе не звычайным эпічным творам, а лірычнай песняй вялікага памеру, песняй-паэмай.

У рамках такога своеасаблівага жанра песні-паэмы Куляшову ўдалося асобнымі штрыхамі лірычнага рысунка паказаць новыя чалавечыя пачуцці ў асабістым жыцці нашай калгаснай моладзі. Для таго, каб паказаць гэта, паэт бярэ адзін эпізод з жыцця маладога чалавека калгаснай вёскі — яго жаніцьбу і вяселле. І паклаўшы ў аснову сюжэтнага разгортвання іменна жаніцьбу і вяселле трактарыста Івана і калгасніцы Хрысціны, Аркадзь Куляшоў паказвае на фоне калгаснай заможнасці новыя глыбокачалавечыя пачуцці ў асабістым жыцці маладых людзей, якія нават у сваім пачуцці кахання, дружбы і таварыскасці з'яўляюцца зусім новымі людзьмі. Першае знаёмства і каханне Івана і Хрысціны абрысавана паэтам ў паэме як новае пачуццё, узнікшае на чыста дзелавых узаемаадносінах маладых людзей:

Не зналі ўсе чыста
І маці не знала —
Калі трактарыста
Яна пакахала?
Ні разу вачамі
На прызьбе арцелі
З дзяўчатамі, з намі
Яны не сядзелі.
Здаралася часам
За трактарам разам
Іх бачыць ў полі...
На прызьбе-ж — ніколі.

І далей вельмі паэтычна ўдала паказаны новыя пачуцці дружбы ў абмалёўцы вобраза Васіля, шчырага адданага друга дзяцінства Хрысціны:

Ён з радасцю новай
І думкай шчаслівай
Блукае дубровай
Па сцежцы маўклівай.
З маленькай дзяўчынкай
Хадзіў ён у лялы.
Сядзець пад хвАінкай
Былі яны рады...

. . . .

Яна ў гэта лета
Пайшла за другога,
І ён ёй за гэта
Не скажа нічога.

Тут-жа А. Куляшоў таксама добра паказвае асабістыя перажыванні Хрысціны, якія арганічна пераплятаюцца з грамадскімі пачуццямі любві да калгаснай працы, да свайго роднага калгаса. Гэта тыповае пачуццё маладога чалавека калгаснай вёскі паказваецца Куляшовым у тым месцы паэмы, калі Хрысціна паехала жыць да Івана. Паэт зарысоўвае вобраз Хрысціны, і праз журботнае перажыванне гераіні аб сваім калгасе ён паказвае зусім новага чалавека, у якога на першым месцы стаіць родны калгас і дружная праца ў брыгадзе:

Шкада ёй брыгады,
Дзе дружная праца,
Шкада сваёй хаты —
Не можа расстацца.

. . . . . .

Дзьме вецер лагодны
Крычыць перапёлка...
Калгасе мой родны,
«Чырвоная зорка»!

Мова паэмы, яе рытміка, як бачна з прыведзеных прыкладаў, прасякнута народнай прастатой і песеннасцю, што робіць паэму даступнаю і зразумелаю шырокім масам.

Але разам з станоўчымі якасцямі паэмы ёсць у ёй цэлы рад і мастацкіх недахопаў. Перш за ўсё слабым месцам паэмы з'яўляецца сюжэтная пабудова твора. Тут ёсць дзве сюжэтныя лініі, якія звязваюцца паміж сабою некалькі механічна і штучна. Першая лінія: у багаты калгас «Чырвоная зорка» да дзяўчыны-калгасніцы Хрысціны з суседняга калгаса прыязджае ў сваты трактарыст Іван са сваёй брыгадай, у якога за першага свата старэйшы брыгадзір. Пасля таго, як Хрысціну засваталі і дагаварыліся аб вяселлі, Іван «з перамогаю» вяртаецца дамоў. І тут-жа ўплятаецца другая сюжэтная лінія. Толькі Іван прыехаў дамоў, яго бацька збіраецца і едзе да большага сына, які служыць у пагранічным атрадзе. Гэты сын, затрымліваючы парушальніка граніцы, быў ранен і таму бацька паехаў адведаць яго. Пасля гэтай падзеі паказваецца вяселле ў калгасе «Чырвоная зорка». Гэта вяселле галоўным чынам адбываецца ў зялёнай дуброве па дарозе ў калгас Івана. Калі вяселле было скончана і «адпеліся песні», бацька Івана вяртаецца ад свайго старэйшага сына-пагранічніка. Прыехаўшы ў хату Івана, Хрысціна едзе зноў у свой калгас, дзе працуе ўвесь час на ўборачнай кампаніі і толькі ўвосень на трохтонцы з сваім пасагам — «хлебам малочаным» — прыязджае да Івана. Яе радасна сустракаюць Іван, свёкар і свякроўа. І канчаецца паэма тым, што гарманіст Васіль, які любіў Хрысціну, ідзе ў Чырвоную Армію, а Хрысціна з сваім мужам Іванам праводзяць яго.

У гэтых двух лініях сюжэта ёсць штучнасць і нацягнутасць. Напрыклад, ёсць некаторая штучнасць у падзеі, калі маладыя і ўся моладзь паехалі з калгаса «Чырвоная зорка» да Івана, дык чамусь спыніліся на паляне ў зялёнай дуброве і там ак зачавалі, гуляючы сваё вяселле. Нематываваным застаецца той момант, калі Хрысціна, прыехаўшы да Івана, **назаўтра-ж** ідзе зноў у свой калгас «Чырвоная зорка», і толькі пасля ўжо ўвосень вяртаецца да свайго каханага. Есць некаторая недапрацаванасць і ў абрысоўцы ўзаемаадносін паасобных персанажных вобразаў. Як напрыклад, вобраз старшыні калгаса, які ў сваіх узаемаадносінах з калгаснікамі і таксама моладдзю не паказваецца як сапраўдны старшыня, а рысуецца нейкім прастачком, які на кожным кроку калі гаворыць, дык усё паўтарае: «падумайце самі». Зусім эскізным з'яўляецца вобраз бацькі Івана. Гэты вобраз толькі эскізна намечан і належным чынам недапрацован. У ім ёсць некаторая цьмянасць і няяснасць. Вобраз Івана, як асноўнага героя паэмы, паказан вельмі бледна, суха, схематычна. Іван ва ўзаемаадносінах з сваімі сябрамі зусім не паказваецца ў сваіх псіхалагічных перажываннях. У сваіх паводзінах, дзеяннях ён не вырысоўваецца як сапраўдны герой, як новы чалавек калгаснай вёскі. Мы ведаем толькі вонкавую характарыстыку Івана, што ён трактарыст, і больш амаль нічога не паказваецца ў гэтым вобразе. Хрысціна ўжо ў гэтых адносінах з'яўляецца больш рэльефным вобразам: яна пададзена ў сваіх псіхалагічных перажываннях. Хоць трэба адзначыць—і ў вобразе Хрысціны ёсць частковая недапрацаванасць; яна ў сваіх глыбокіх пачуццях не паднята на належную мастацкую вышыню. Вобразы бацькі Івана і старэйшага брата Івана, асталіся дзесьці збоку асноўнага сюжэта паэмы; яны таксама недапрацаваны ў той час, калі патрэбна было іх звязаць з асноўным стрыжнем сюжэта і паказаць больш ярка і поўнакроўна.

Што датычыць вершаванай рытмікі паэмы, дык трэба сказаць, што яна, з'яўляючыся ўвогуле добраю, гібкаю і песенна-лёгкаю, мілагучнаю, аднак, у паасобных месцах не адпавядае ідэйнаму і тэматычнаму характару асобных падзей паэмы. Рытміка гэтага твора ад пачатку да канца прасякнута мінорнай песеннасцю. І там, дзе паэт паказвае вобраз Васіля і Хрысціны, дае карціны сватання і вяселля, дык гэты рытмічны склад адпавядае мастацкаму характару адлюстравання перажыванняў людзей, якія неяк насвойму сумуюць і радуюцца. У тых-жа месцах паэмы, дзе даецца лірычная замалёўка дружнай калгаснай працы калгаснай заможнасці, — гэты мінорна-элегічны рытм, застаючыся па свайму характару аднолькавым, не імпануе жыццёвым з'явам і не заўсёды адпавядае зместу малюнка. Мы не гаворым, што для гэтых месц паэмы павінен быць другі рытмічны размер: напрыклад, замест двухстопнага амфібрахія, ну, які-небудзь чатырохстопны ямб. Не, усякім размерам можна паказаць разнастайныя нюансы перажыванняў чалавека. Той-жа самы двухстопны амфібрахій або чатырохстопны ямб, у залежнасці ад ідэйнага пафаса паэта можа быць у адных выпадках мінорным, а ў другіх — мажорным, радасным, вясёлым. І так з усякім размерам. Значыць, справа не ў рытмічным размеры, а ва ўменні паэта аднолькавы размер зрабіць разнастайна-рытмічным. Куляшову не заўсёды ўдавалася гэта здзейсніць у данай паэме.

У мове паэмы, якая наогул з'яўляецца мовай сакавітай і глыбока народнай, ёсць асобныя традыцыйныя звароты, якія ўзяты паэтам з дарэволюцыйнага фальклёра і механічна перанесены ў паэму. Так, напрыклад, чамусьці дзяўчаты-калгасніцы ў Куляшова выходзяць на працу **«ў зрэбных сарочках»**, у той час, калі слова «зрэбны» нехарактэрна ва ўмовах сучаснай калгаснай вёскі.

І далей, калі аўтар дае карціну калгаснага жніва ў калгасе «Чырвоная зорка», калі дзяўчаты вышлі на калгаснае поле жаць, то чамусьці іх сярпы параўноўваюцца з шаблямі: «сярпы як шаблі», у той час, калі на калгасным полі жнуць жняркай, а дзяўчаты толькі вяжуць снопы. Есць у паэме і іншыя паэтычныя шархаватасці. Напрыклад: «па ўсёй гаспадарцы брыгадныя станы» — гучыць вельмі празаічна і няўдала. Або: «ужо са сватамі **саймуецца** маці», — слова **саймуецца** тут ужыта не да месца і яно зацямняе паэтычны сэнс. Аб старшыні калгаса, напрыклад, сказана, «на варце ўрадджаю ён ходзіць з дзеламі і ўсіх навучае, каб думалі самі», — таксама няўдала і няясна.

У заключэнне трэба сказаць, што не гледзячы на недахопы ў разглядаемай паэме Куляшова, усё-ж гэты твор напісаны ў плане лірычнай песні на вельмі актуальную новую тэму нашага жыцця, тэму ўзаемаадносін у асабістым жыцці нашай калгаснай моладзі і з'яўляецца творчай удачай паэта і радаснай з'явай у нашай беларускай паэзіі.

ДЗЯРЖАЎНЫ ВІЦЕБСКІ ТЭАТР ★★ „ЛЮБОЎ ЯРАВАЯ"

У настаўніцы Любві Яравой у часе вайны загінуў без весткі муж — паручык Яравы. Прайшлі годы. Настаўніца прымірылася ўжо з думкаю аб страце мужа, і раптам спатыкаецца з ім. Але... яны знаходзяцца ў супроцьлеглых лагерах. Паміж улюблёнымі некалі супругамі пачынаецца жорсткая барацьба, а ў кожным з іх яшчэ больш моцная барацьба пачуццяў любві і абавязку, у выніку якой настаўніца Яравая загартоўваецца ў бальшавіка-рэвалюцыянера, а паручык Яравы гіне.

Сіла твора ў тым, што драма гэтых двух людзей неразрыўна звязана з надзвычайна шырокімі падзеямі грамадзянскай вайны, якія, вырастаючы ў самастойную сюжэтную пабудову, уздымаюць барацьбу гэтых двух індывідуумаў да вышынь барацьбы двух ідэй і асабістая драма двух герояў п'есы перарастае ў драму барацьбы двух класаў.

Другой каштоўнай якасцю гэтага твора з'яўляецца галярэя мастацкіх вобразаў, лёс якіх цесна звязан з лёсам рэвалюцыі. Галярэя гэта настолькі рознастайная і багатая, што бачачы на сцэне некалькі эпізодаў грамадзянскай вайны, — бачыш усю Расію тае эпохі.

Аўтар п'есы К. Трэнеў разгортвае перад гледачом шырачэзнае палатно падзей і вобразаў. Хаця тэатр у асноўным справіўся з сцэнічнай інтэрпрэтацыяй гэтага твора, але мы не можам сказаць, што ўвесь багацейшы матэрыял п'есы поўнакроўна і дакладна паказан ім са сцэны.

Любоў Яравая — маладая, прыгожая жанчына, страціўшая сваё асабістае жыццё, інтэлігентка-настаўніца, якая не задумваючыся ідзе з народам і гатова аддаць яму ўсё сваё жыццё, раптам сустракае даўно ўжо пахаванага ў душы мужа, які жыў з ёю некалі аднымі думкамі і пачуццямі, але зараз ён — на другім баку барыкад. Пачынаецца доўгая ўпартая барацьба супярэчлівых пачуццяў — любві да мужа, — нянавісці да ворага. Вынік гэтага—напружанне волі, хвіліна слабасці, выкарыстаная контрразведчыкамі, пакуты за гэтую хвіліну, самаафярнасць, і зноў напружанне волі. Якое багацце перажыванняў! Які багаты матэрыял! Але ў выкананні артысткі Глебаўскай Любоў Яравая не раскрывае перад намі ўсяго гэтага багацця вобраза. Замест глыбокіх і супярэчлівых пачуццяў Любы мы бачым бледны вонкавы вынік гэтых пачуццяў. Артыстцы Глебаўскай трэба больш уважліва і ўдумліва прааналізаваць ролю Яравой і знайсці ў ёй сапраўдную чалавечую цеплыню, знайсці сродкі выяўлення глыбокіх чалавечых пачуццяў, карацей кажучы—самастойна прарабіць тую работу над вобразам, у якой не дапамог ёй пастаноўшчык спектакля.

Бліскучы малюнак акторскай работы бачым у выкананні артыстам Малчанавым ролі паручыка Яравога. Тут актор, дакладна ўладаючы багаццем сцэнічных сродкаў, вельмі ўдала раскрывае перад гледачом вобраз контрразведчыка—лютага ворага, які не спыняецца ні перад чым у дасягненні сваёй мэты. Ён не толькі падпарадкуе свае пачуцці імкненню контрразведчыка, але нават выкарыстоўвае іх. У сцэне аб'яснення Яравога з Любоўю ля брамы дома, дзе хаваецца Кошкін, актор П. Малчанаў некалькімі інтанацыямі здолеў данесці да гледача тое, што Яравы выкарыстоўвае сваё пачуццё, каб «накрыць» ненавіснага яму Кошкіна.

Контррэвалюцыя разгромлена, контрразведчык Яравы губляе сваю ўпэўненасць, трывожыцца за лёс контррэвалюцыі.

З вялікім майстэрствам перадае П. Малчанаў гэтую разгубленасць заядлага белагвардзейца, дзякуючы чаму да гледача даходзіць аўтарская думка, што ў гэтай страце сілы і надзей—смерць контррэвалюцыі.

Надзвычайна шчыра і мякка выконвае заслужаны артыст БССР Ільінскі ролю Швандзі. У выкананні тав. Ільінскага гэта малады матрос, для якога, пры ўсёй яго непісьменнасці, а часам і наіўнасці, у барацьбе няма ніякіх загадак. Ён ведае сваё месца ў рэвалюцыі. Артыст Ільінскі зразумеў, што ў сцэне вызвалення Яравой з-пад арышту Швандзя, гэты просты матрос, іграе ролю князя Курносаўскага. Артыст праводзіць гэтую сцэну сапраўды так, як павінен быў-бы правесці яе сапраўдны Швандзя, паводле свайго ўяўлення аб Курносаўскіх.

Шчыра, проста і пераканаўча выконвае актор Звездачотаў ролю камісара Кошкіна, чэснага і адданага камуніста. Хвалюючы праводзіць Звездачотаў сцэну з камендантам Грозным, разгортваючы перад гледачом малюнак мужнасці і бальшавіцкай непрымірымасці. З такой самай надворнай стрыманасцю на глыбока захаваным, але для гледача відавочным, пачуцці праводзіць актор Звездачотаў і сцэну з прафесарам Гарнастаевым у першай дзеі.

Артыст Драздоў у ролі каменданта Грознага не здолеў перадаць гэтую буйную натуру з яе знадворнай рызыкай і глыбока захаванай баязлівасцю, прагнасцю да жыцця і страхам за гэтае жыццё ў апошні момант сцэны з Кошкіным.

Артыст Сяргейчык стварыў цікавы вобраз прафесара Гарнастаева. Аднак аднолькавая фарба дзіцячай наіўнасці абядняе вобраз, і глядач пачынае лічыць прафесара нейкім дзіваком, а праз гэта гіне і сцэна прафесара з Яравым і іранічны сказ Гарнастаева: «Пусціце Дуньку ў Еўропу», бо гэтых момантаў глядач зусім не чакае ад крыху блазнаватага прафесара. Тав. Сяргейчыку варта было-б унесці ў выкананне ролі Гарнастаева элементы іроніі ў некаторых развагах, а ў некаторых момантах—элементы больш сур'ёзнага незадавалення. Тав. Сяргейчыку не трэба забываць, што Гарнастаеў прадстаўнік інтэлігенцыі, які глядзіць на падзеі жыцця не толькі з добрадушнай усмешкай, але і глыбока ўспрымае іх. Ён, прайшоўшы праз пэўны этап рэвалюцыі, знаходзіць у ёй сваё месца, ад якога раней, з-за сваіх інтэлігенцкіх забабонаў, адмовіўся.

У артысткі Лагоўскай нехапае дастатковай шчырасці ў выкананні ролі жонкі Гарнастаева. Е. Лагоўская ідзе галоўным чынам у напрамку вонкавага раскрыцця ролі, а праз гэта шмат траціць вобраз інтэлігенткі-абывацельніцы.

Артыст Вялікі не здолеў выкарыстаць усё багацце ролі прайдзісвета — прыстасаванца, спекулянта і афэрыста Елісатава. Елісатаў у выкананні арт. Вялікага занадта просты і нязграбны. Няма ў ім той змяінай гібкасці, роўнадушнага цынізму, замаскаванага шчырасцю ці прыяцельскай усмешкай двудушша, драпежніцкай хваткі, якія дадзены яму аўтарам.

Артыст Матусевіч правільна зразумеў і з пачуццём выконвае ролю Чыра, даючы аднача́сова цікавы вонкавы малюнак вобраза.

З вялікім багаццем інтанацый і рухаў выконвае артыстка Радзялоўская ролю Пазовай Створаны тав. Радзялоўскай вобраз шчыры і пераканаўчы. Артыстка здолела бездагана пераказаць усю складанасць і заблытанасць пачуццяў гэтага хітрага і вельмі небяспечнага ворага з усёй яго нянавісцю да народа, з усёй яго здольнасцю да маскіроўкі, інтрыгі і здрадніцтва.

Маладому артысту Фадзееву не ўдаўся вобраз манцёра Коласава — недарэчнага, але палкага летуценніка. Адчуваецца, што актор не знаходзіць сапраўдных пачуццяў, што рэжысура не дапамагла яму знайсці іх. І пры прыблізна правільным вонкавым малюнку вобраза артыст сапраўдныя чалавечыя пачуцці палмяняе нервовасцю, ці ўсхваляваным рэзанёрствам.

Дунька ў выкананні артысткі Заранок надта крыклівая, з таму аднатонная. Выкананне ролі арт. Заранок часам нават крыху шаржыраванае. Аднак сапраўднае пачуццё, з якім арт. Заранок вядзе ролю, прымушае даравацць маладой артыстцы заганы яе выканання.

Рысунак ролі цёткі Мар'і зроблен артысткай Бандарчык зусім правільна, але, на жаль, гэтым арт. Бандарчык і абмежавалася, а ў выніку,—за правільным рысункам вобраза—абсалютная пустата і роўнадушша. Роўнадушша і ў яе галашэнні, і ў радасці пры сустрэчы з сынам, і ў горы, і ў заклапочанасці, і ў гневе. І з-за гэтага роўнадушша гіне драма маці, якая шукае сваіх сыноў і скрозь слёзы смяецца, знаходзячы іх.

Досыць шчыра і пераканаўча выконвае артыстка Гепнер ролю Махоры. На жаль, у другой выканаўцы гэтай ролі—артысткі Бялай адчуваецца некаторы ўхіл да шаржа.

Цікавы і арыгінальны вобраз салдата Пікалава стварыў актор Іваноў. Артыст Іваноў здолеў паказаць інертнасць і абыякавасць змораннага вайной, апранутага ў салдацкі шынель селяніна, якому да нудоты абрыдла ваяваць, але які разам з тым прасякнуты ўсведамленнем свайго абавязку.

Вельмі прыкрае ўражанне пакідае афармленне спектакля мастаком Басулаевым. Аграмадная канструкцыя, якая не толькі не дапамагае рэжысуры і акторам у пабудове мізансцэн, але часам перашкаджае ў гэтым. Апроч таго, з-за такой устаноўкі афармленне паасобных сцэн і малюнкаў не мае адзінага стылю. Яно часам натуралістычнае, часам рэалістычнае, а часам і вельмі ўмоўнае, нават недарэчнае.

Хаця ў спектаклі ёсць трапныя мізансцэны, як напрыклад першая сцэна Швандзі з Махорай, але асаблівай рэжысёрскай выдумкай спектакль не вызначаецца.

Музыка кампазітара Л. Маркевіча нічога не дадае да агульнага ўражання і з аднолькавым поспехам яна магла-б і адсутнічаць, або быць заменена на іншую.

Агульнае ўражанне такое, што спектакль недапрацаваны. Тэатру не прыходзіцца спасылацца на тое, што ён за два гады некалькі згубіў свае дадатныя якасці, бо такім ён быў і два гады назад, калі Менск бачыў яго ўпершыню. Праўда, выкананне некаторых роляў за гэты час палепшылася, некаторых пагоршылася, але агульнае ўражанне недапрацаванасці застаецца. А між тым п'еса «Любоў Яравая» заслугоўвае з боку тэатра значна большай увагі, бо ў ёй ёсць рад не толькі высокамастацкіх вобразаў, напісаных смелай рукой сапраўднага мастака К. Трэнева, але п'еса дае і яскравае, праўдзівае ўяўленне аб ролі і месцы інтэлігенцыі ў соцыялістычнай рэвалюцыі, без усялякай лакіроўкі, праўдзіва паказвае героіку грамадзянскай вайны.

Алег СОЖЫН.

Арк. ГЕЙНЕ

ШЧАСЛІВАЯ ЗОРКА

Помніш—летняй ноччу цёмнасіняю—
Шчаслівейшай нашаю парой —
Слухалі мы песню салаўіную
У зялёным садзе над ракой.
Месяц з-за высокіх ліп квітнеючых
Усміхаўся ласкавым святлом.
Зоркі, ясным бляскам палымнеючы,
Палалі далёка за сялом...
У народзе ёсць павер'е гэткае —
Быццам мае кожны чалавек
Зорку ў небе, для яго прыметную,
І яе жыццё—ягоны век...
Парашылі мы тады з усмешкаю:
Ты сабе асобна, я—сабе,—
Выбраць шчаслівейшую, найлепшую
Зорку...
Я спытаўся у цябе:
— Ну, твая напэўна там, што свеціцца,
Дзе ляжыць вялікі Млечны шлях,
Або там, дзе зорная «Мядзведзіца»,
Самая ярчэйшая... —
Ці так?..
Ты зірнула ў ночы даль маўклівую
І сказала:—Не, не адгадаў,
Выбрала я самую шчаслівую,
Што ў Крэмлі...
І выбар наш супаў..

—о—

„ГОДЫ ВЫПРАБАВАННЯЎ"

У Менскім гаркоме ЛКСМБ адбылося чытанне п'есы «Годы выпрабаванняў» Е. Раймонд. На чытанні прысутнічалі работнікі гаркома, прадстаўнікі камсамольскага актыва і пісьменнікі.

П'еса «Годы выпрабаванняў» адлюстроўвае антыфашысцкую барацьбу нямецкага камсамола ў 1937 годзе. Як паведаміў аўтар, твор гэты напісан па матэрыялах, якія друкаваліся ў совецкай прэсе.

Выступаючы ў спрэчках таварышы Ліберман, Кучар, Рапапорт, Агняцвет, Есакоў і інш. указалі на рад істотных недахопаў п'есы. Гаварылі аб тым, што ў творы не паказана работа камсамольскай арганізацыі і кіраўніцтва ёю з боку партыйных арганізацый. Вобраз палітычнага кіраўніка Вульфа займае ў п'есе нязначнае месца, прычым не ярка адлюстравана яго камуністычная работа сярод моладзі. Адсутнічае работа камсамола Германіі сярод рабочай моладзі. Незразумела, як вясковы хлопец Эрык адразу трапіў у камсамол, калі ўся арганізацыя знаходзілася ў падполлі. Не апраўдан у п'есе пераход штурмавіка Франца (у мінулым вясковага хлопца) на бок камуністаў. Многа месца адводзіцца ў п'есе размовам фашыстаў, што ні з боку ідэйнага напрамку твора, ні з сюжэтнай пабудовы драмы не выклікае аніякай патрэбнасці.

Усё гэта сведчыць аб тым, што аўтару і Тэатру юнага гледача трэба яшчэ сур'ёзна дапрацоўваць і перарабляць гэты драматургічны твор.

Нас здзіўляюць безадказныя адносіны рэперткома (тав. Галубіцкая) да дазволу гэтай п'есы, у той час як яна мае значныя як палітычныя, так і драматургічныя памылкі.

Тэатр юнага гледача рыхтуе гэты спектакль у падарунак маперы-радзіме і прысвячае яго 20-годдзю ленінска-сталінскага камсамола, таму падарунак павінен быць варты свята.

Спектакль «Годы выпрабаванняў» павінен выклікаць у совецкай моладзі пачуццё нянавісці да фашыстаў; ён павінен узбагаціць запас ведаў нашага маладога пакалення і паказаць усю веліч антыфашысцкай барацьбы замежнага камсамола.

„ВОГНЕНЫЯ ГОДЫ"

Кадр з фільма. Партызан дзед Яўхім. (Заслужаны артыст Пельцэр).

★ ★ ★

Беларуская кіностудыя «Совецкая Беларусь» скончыла здымкі натуры для вялікага гукавога гістарыка-рэвалюцыйнага фільма «Вогненыя годы» па сцэнарыю Лукоўскага і Наўроцкага (рэжысёр заслужаны дзеяч мастацтва В. В. Корш, шэф апаратара Беляеў, апаратар Пагодзін, мастак Савосцін). У галоўных ралях здымаюцца: заслуж. артыст рэспублікі Скарабагаты, заслуж. артыст рэспублікі Пельцэр, артыст Каваль-Самбарскі, украінскі артыст Кананенка.

Фільм здымаецца ў двух варыянтах—рускім і беларускім, і па плану павінен быць закончан у лютым 1939 года. Фільм пакажа гісторыю партызанскага руху ў БССР. Натура здымалася ў Вышгарадзе, пад Кіевам. Зараз робяцца павільённыя здымкі.

Музыку піша беларускі кампазітар—дэпутат Вярхоўнага Совета БССР Туранкоў.

І. ГОЛЬДРЫНГ.

НА ПАСЯДЖЭННІ ПРАЎЛЕННЯ ССП БССР

НОВАЯ ПАЭМА А. КУЛЯШОВА

5 кастрычніка адбылося чарговае пасяджэнне Праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР. Уключэнне ў парадак дня пытання аб новай паэме А. Куляшова «У зялёнай дуброве» выклікала вялікую цікавасць пісьменнікаў.

Даклад аб паэме зрабіў тав. Ларчанка. У спрэчках выказаліся тт. Ліўшыц, Клімковіч, Броўка, Мальцінскі, Сярэбраны, Бядуля, Бярозкін, Глебка, Куляшоў і Лынькоў. Амаль усе выступаўшыя адзначылі, што паэма «У зялёнай дуброве» з'яўляецца дасягненнем не толькі А. Куляшова, але і ўсёй беларускай совецкай паэзіі. Тэма паэмы — аб новым быце ў калгасе, аб новых узаемаадносінах совецкай моладзі, узнікшых у новых, соцыялістычных умовах. На фоне сватаўства трактарыста аднаго калгаса да брыгадзіра звяна другога калгаса паказана любоў нашай моладзі да калгаснай працы, прывязанасць да калектыва, адданасць агульнай справе. Паэма ў асноўным добра напісана. Мова паэмы, яе рытміка прасякнута фальклёрнай песеннасцю, глыбокай лірыкай. Напісана яна проста, без вычурнасці, і ў гэтай прастаце яе абаяльнасць. У паэме — добрае веданне калгаснай вёскі, прычым гэтае веданне не выпукляецца назойліва, як у некаторых іншых паэтаў. Наогул—паэма з'яўляецца ўдачай маладога паэта. Разам з тым выступаўшыя адзначылі паасобныя недахопы паэмы сюжэтнага і стылявога характара, некаторую недапрацаванасць паасобных месц. Указвалі на дзве сюжэтныя лініі ў паэме, якія недастаткова ўвязаны паміж сабой. У абрысоўцы паасобных вобразаў (Івана, Васіля) сквозіць некаторая штучнасць. Ёсць і паасобныя апіскі, няўдалыя вобразы. Асабліва няўдала і няверна Куляшоў малюе ўражанні Хрысціны ад суседняга калгаса, а таксама недастаткова матываваны раптоўны ўход Хрысціны ад мужа на другі-ж дзень пасля прыезда.

Ацаніўшы паэму, як дасягненне А. Куляшова, пісьменнікі актыву параіў яму яшчэ папрацаваць над ёй, адшліфаваць яе і вынесці на шырокае абмеркаванне чытача.

***

Праўленне Саюза ССП заслухала таксама інфармацыю аб нарадзе пісьменнікаў-чырвонаармейцаў БАВА 10—11 лістапада б. г. у Смаленску. Для ўдзелу ў нарадзе вылучана брыгада ў складзе тт. Чорнага, Шапавалава, Клімковіча, Бядулі, Броўкі і Кучара, якім даручана падрыхтаваць даклады аб творчасці рада пісьменнікаў-чырвонаармейцаў. Вырашана таксама падрыхтаваць выданне двух зборнікаў паэзіі і прозы чырвонаармейскіх аўтараў.

Праўленне ССП БССР установіла ў Доме пісьменніка штодзённыя дзяжурствы членаў Праўлення.

П.

—о—

НАРАДА ДРАМАТУРГАЎ

Днямі Упраўленнем па справах мастацтваў была склікана нарада драматургаў БССР па абмеркаванню пытанняў іх творчай работы. У нарадзе прынялі ўдзел прадстаўнікі Усесаюзнага Камітэта па справах мастацтваў пры СНК СССР тт. Грынберг і Розенталь.

Выступаючыя на нарадзе адзначылі адставанне беларускай драматургіі ў справе павароту да тэм сучаснасці, стварэння мастацка-поўнацэнных п'ес аб нашай рэчаіснасці. Яны ўказалі і на тое, што п'есы нашых драматургаў у рэпертуарах тэатраў патрабуюць далейшай дапрацоўкі.

Драматургі БССР расказалі аб сваіх творчых планах на бліжэйшы час. Тав. З. Бядуля мяркуе напісаць п'есу на тэму калгаснага жыцця. К. Крапіва прыступіў да напісання новай сатырычнай камедыі, таксама на сучасную тэматыку. На гістарычную тэму — аб Крычаўскім паўстанні — мяркуе напісаць п'есу Якуб Колас.

Драматургі ў сваіх выступленнях адзначылі адсутнасць добрага мастацкага кіраўніцтва нашымі тэатрамі, што адбіваецца на творчай сувязі драматургаў з тэатрамі. Рэзкай крытыцы была падвергнута работа секцыі драматургаў саюза пісьменнікаў, якая мала займаецца творчымі пытаннямі. Драматургі выказалі рад пажаданняў у галіне дапамогі ім з боку Упраўлення па справах мастацтваў і Усесаюзнага Камітэта.

ДЖУЗЕПЕ ВЕРДЗІ І СОВЕЦКІ ОПЕРНЫ ТЭАТР

ДА 125-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ Д. ВЕРДЗІ.

ДЖУЗЕПЕ Вердзі, вясковы хлопец, вучань вясковага арганіста, не быў прыняты ў кансерваторыю, як не праявіўшы музыкальных здольнасцей. І, па сутнасці гаворачы, гэтае непрызнанне яго афіцыяльным музыкальным светам праследвала яго ўсё жыццё, не гледзячы на велізарную папулярнасць яго опер ва ўсім свеце, не гледзячы на ганаровыя званні, заслужаныя ім пазней, не гледзячы на велізарную любоў да яго італьянскага народа, зрабіўшага яго імя сімвалам нацыянальнай незалежнасці аб'яднанай Італіі. І яшчэ так нядаўна, нават у нас, знаходзіліся псеўдавучоныя педанты, называўшыя музыку Вердзі «шарманачнай», лічыўшыя нястрымную цягу публікі да яго опер прызнакам падзення густаў і выключаўшыя яго з раду «неўміручых», якімі было так багата XIX стагоддзе. Супроцьстаўленне Вердзі Вагнеру, стаўшае для нас яўным перажыткам, яшчэ да гэтага часу мільгае ў «творах» заходніх музыказнаўцаў.

Яшчэ зусім нядаўна, у перыяд захаплення ленінградскіх музыкальных колаў фармалістычнай заходняй музыкай (Кшэнэк, Хіндэміт, Берг), мне, кіраваўшаму Ленінградскім тэатрам оперы і балета, даводзілася весці барацьбу за Вердзі, уводзячы ў рэпертуар даўно не ішоўшыя ў нас яго оперы: «Бал-маскарад», «Отэло», «Фальстаф» (сумесна з С. А. Самасудам).

Гэтыя дні ў мінулым. Уяўныя фармалістычныя тэндэнцыі разбіты ўшчэнт, але і зараз яшчэ ёсць нямала музыкантаў, якія прызнаюць геніяльнасць апошніх опусаў вялікага італьянца і спагадліва даруюць яму «трывіяльнасць» «Травіяты», «Рыгалета» і «Трубадура».

У выдатнай кнізе Верфеля «Вердзі—раман оперы» (якая зараз у нас перавыдаецца і якую я ўзмоцнена рэкамендую ўвазе ўсіх любячых музыку), дана бліскучая ацэнка ўсім памылковым толкам крытыкаў канца дзевятнаццатага века і пачатку дваццатага, не здолеўшым зразумець пераемнасці ў развіцці опернага мастацтва і непарыўнай сувязі творчасці Вердзі з творчасцю геніяў мінулага і будучага. Верфель з незвычайнай яснасцю раскрывае сутнасць гуманітарнага ўздзеяння на чалавецтва гэтага, прасякнутага жаласцю да пакут людзей, музыканта, ўзрошчанага народнай творчасцю і творчасць якога стала народнаю. Верфель выкрывае спробы некаторых крытыкаў аднесці «італьяншчыну» да мяшчанска-салонных захапленняў, тармозячых развіццё рэалістычнага опернага тэатра.

Для совецкага опернага тэатра апошняе пытанне з'яўляецца асабліва важным: знішчаючы апошнія астаткі «Вампукі» на нашых оперных сцэнах, мы разам з тым павінны вельмі добра разумець, што трэба называць гэтым недарэчным імем. Я заўсёды трымаўся тае думкі, што пад «Вампукай» трэба разумець сістэму опернага спектакля, дзе ідэйны і сэнсавы бок прынесены ў афяру паказу вакальнай віртуознасці і трукавай тэатральнасці, апіраючайся на экзотыку і, па большай частцы, убогую расфранчанасць опернага спектакля. Мне даводзілася бачыць «вампучныя» пастаноўкі «Барыса Галунова», адной з самых моцных па рэалізму опер рускага музыкальнага генія. Між тым у нас прынята лічыць, што «Вампука» гэта пародыя на «Аіду» і, наогул, датычыць італьянскай оперы (што зусім няверна, бо аўтар «Вампукі» Эрэнберг гаварыў мне асабіста, што ён меў на ўвазе гранд-оперы тыпу «Афрыканкі» Мейербера). Легенда аб «вампучнасці» опер Вердзі трымаецца толькі дзякуючы таму, што нашыя тэатры па большай частцы падыходзяць да пастановак «хадавых», любімых публікай опер з асаблівай неахайнасцю. «Травіята», «Рыгалето» ды і «Аіда» вельмі часта разглядаюцца, як прахадныя спектаклі, даручаюцца найменш моцным рэжысёрам, моў, «тут справа ў спяванні» і толькі. На «Аіду» іншы раз затрачваюцца нямалыя грошы, але толькі, каб блІснуць «шыкарнымі» дэкарацыямі і касцюмамі. Пастаноўка падмяняецца абстаноўкай. Справа схіляецца да «Вампукі». Выпрацаваўся штамп выканання Альфрэдаў, Віолет, Аманасро, Рыгалето. Альфрэд павінен быць «душкай тэнарам», Аманасро «бліскаць вачамі і круціць бялкамі» і т. п. Вампука спраўляе ўрачыстасць.

На жаль, за нямногімі выключэннямі справа абстаіць так і зараз на нашых оперных сцэнах, і не толькі перыферыйных.

Вердзі неабходны совецкай опернай сцэне, як носьбіт высокіх гуманітарных ідэй свайго часу, як рамантык-рэаліст, як наватар, які зблізіў оперные лібрэта з сучаснай яму драматургіяй, як геніяльны выражальнік італьянскай музыкальнай народнай творчасці. Уздзеянне яго опер на нашага гледача бязмежнае і карыснае.

Незабыўны С. М. Кіраў, які аддаваў вялікую ўвагу ленінградскаму опернаму тэатру, вельмі любіў наведваць спектакль «Бал-маскарад», і калі я ў гутарцы з ім паскардзіўся на тое, што мяне лаюць за выбар гэтай оперы, сказаў мне: «Не звяртайце ўвагі,— гэта благародная і вельмі патрэбная опера».

Оперы Вердзі — благародны ў нашым сэнсе слова — гэта значыць, што яны выхоўваюць пачуцці гонару, абавязка, патрыятызма, чэснай дружбы, чэснай любві. Яны таксама патрэбны як творы Гюго, Шылера, Шэкспіра, якія Вердзі браў у аснову сваіх лібрэта і якія ён умеў геніяльна ператвараць у музыкальныя вобразы.

Але Вердзі трэба сур'ёзна і ўдумліва ставіць. Наш оперны тэатр у вялікім даўгу ў гэтага вялікага майстра. Некалі гастролі італьянскай оперы, якія наладжваліся лоўкімі антрэпрэнёрамі, з мэтай нажывы на паказе славутых італьянскіх спевакоў-віртуозаў, стварылі штампы для пастановак тыпу «канцэрт у касцюмах». Публіка ішла слухаць Мазіні, Батысціні, Арнольдсон, а не оперу, як такавую. Гэты рафініраваны глядач паграджаў тэатр і смакаваў віртуозаў. Перажыткі гэтай далёкай эпохі захаваліся ў нас да гэтага часу. Пара з імі разлучыцца. Вердзі трэба майстэрска спяваць, іграць і ставіць, пры тым ставіць не зніжаючы яго благароднага рамантызма і не ў школу вакальным задачам спевакоў, што наглядаецца пры некаторых спробах абнаўлення яго опер. З гэтага пункту гледжання надзвычай прыкра замысловатая і штучная пастаноўка «Травіяты» ў тэатры імя Неміровіча-Данчэнка (рэжысёр Мордвінаў), некалі ўзнесеная нашай крытыкай часоў спроб механістычнага пераносу мейерхольдызма на оперную сцэну. Сумесь натуралізма (сапраўдныя рэчы) з туманным соцыялагізмам, падэным сімвалічна, скажэнне музыкальных вобразаў (партыя Жэрмона), надзвычайна зніжаны агульны тонус (вакальнае ўпрашчэнства) — усё разам узятае — суцэльная памылка і памылка прэтэнцыёзная. Вядома, не па гэтаму шляху павінна ісці абнаўленне пастановачных прыёмаў опер Вердзі ў совецкім тэатры. Благародныя оперы трэба ставіць благародна і проста, выяўляючы іх ідэйную сутнасць у форме рамантычнага рэалізма і злішча музыкальных вобразаў з вобразамі сцэнічнымі.

В. РАПАПОРТ.

Галоўны рэжысёр Беларускага дзяржтэатра оперы і балета.

НА БУДАЎНІЧЫХ ПЛЯЦОЎКАХ

Будаўніцтва **Вялікага опернага тэатра ў Менску** падыходзіць к канцу. Знадворных тынкавальных работ засталося процантаў 15. Заканчваюцца ўнутраныя малярныя работы. Праводзяцца іспыты сістэмы ацяплення, супроцьпажарнага абсталявання (спрынклераў).

Затрымліваецца электра-і радыёабсталяванне. Першае — з-за недахвату кабеля і электрычнай апаратуры, другое — па віне Упоўнаркамсувязі з-за дробных грашовых разлікаў. Замест таго, каб па гэтых разліках звярнуцца ў арбітраж, Упоўнаркамсувязі (намеснік упаўнаважанага тав. Краўчук) наладзіў канцэлярскую перапіску і тармозіць радыёфікацыю тэатра.

Няма яшчэ праектаў дымавых клапанаў (супроцьпажарных прыстасаванняў). Праектныя і мантажныя работы па ўстаноўцы дымавых клапанаў перададзены «Тэакінопраекту» (у Маскве), што апошні не спяшаецца з выкананнем заказа.

Трэст кафэ і рэстаранаў, які павінен абсталяваць у тэатры буфеты, да работы яшчэ не прыступіў.

Не пачата яшчэ ўпарадкаванне плошчы перад тэатрам. Не гледзячы на рад указанняў Соўнаркома БССР, Менскі горсовет да гэтай работы не прыступае.

Трэба прыняць рашучыя меры, каб закончыць будаўніцтва тэатра ў тэрміны, вызначаныя ЦК КП(б)Б і СНК БССР.

***

Недалёка ад Вялікага опернага тэатра ў Менску будуецца чатырохпавярховы дом — **інтэрнат для двухсот студэнтаў Менскага тэатральнага вучылішча.** Будаўнічая пляцоўка вызвалена ад іншых будынкаў, выкапан катлаван. Але на гэтым работы застапарыліся. Менбуд нікуды не спяшаецца. Ён нават не завёз яшчэ будаўнічага камення і цэглы. Капіталаўкладанні не асвойваюцца.

***

Заканчваецца будаўніцтва **майстэрняў і склада** для вырабу і хавання дэкарацый Белдзярждрамтэатра ў Менску. Кошт пабудовы — каля ста тысяч рублёў. Дэкарацыі тэатра, якія да гэтага часу, з-за адсутнасці памяшкання, валяліся на гарадскім скверы пад адкрытым небам і загрувашчвалі праходы, будуць зараз забраны.

***

Заканчваецца капітальны рамонт **Бабруйскага гарадскога тэатра.** Драўляныя перакрыцці заменены жалезабетоннымі, асушаны залітыя грунтавой вадой сутарэнні, перароблены ацяпленне, вентыляцыя. Рамонт будзе каштаваць 270.000 рублёў. З лістапада ў гэтым памяшканні пачнуцца гастролі Дзяржаўнага Яўрэйскага тэатра.

***

Вялікі рамонт праводзіцца ў **Магілёўскім гарадскім тэатры.** Рамантуецца вярчальнае кола на сцэне, робяцца механізаваныя дэкарацыйныя пад'ёмы, ліквідуюцца такі перажытак мінулага, як стаячыя месцы. Тэатр абсталёўваецца зручнымі крэсламі. Праводзяцца таксама тынкавальныя і малярныя работы.

Нам. адказнага рэдактара А. Р. ВАРАШЫЛАЎ.

Друкарня «Звязды». Газета выходзіць раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Уп. Галоўлітбела № Б—5729.